ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА ПА НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫМ ЗАБЕСПЯЧЭННІ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ ГОРАДА МАГІЛЁВА



## Паэтычны зборнік

# “Спроба пяра”

**Выпуск 4**

**Магілёў 2022**

*Сябры!*

*Перад вамі чацвёртая кніга вершаў маладых аўтараў, пераможцаў гарадскога конкурсу юных паэтаў “Спроба пяра”.*

*У зборнік увайшлі больш за 140 лірычных твораў. Гэта развагі аб малой Радзіме, беларускай мове, ролі настаўніка ў жыцці чалавека, славутых дзеячах Беларусі, аб пошуку чалавечых каштоўнасцей.*

*Кожная старонка зборніка – непаўторны свет, незвычайная, дзіўная краіна дзяцінства, радасці, света, каляровых фарбаў. Добрыя і замілаваныя, непасрэдныя і пранікнёныя, гэтыя вершы прымушаюць здзіўляцца, радавацца, суперажываць, спадзявацца і марыць.*

*Прачытайце самі, і ваша сэрца адчуе душэўную, шчырую цеплыню. Мы ўпэўнены, што сустрэча з нашымі маладымі аўтарамі прынясе вам задавальненне!*

*Работы прадстаўлены па раздзелах “Мой родны кут”, “Славутыя імёны Беларусі”, “Настаўніку прысвячаецца”, “Ёсць такая прафесія – Радзіму абараняць”, “Беларуская мова”, “Вершы на вольную тэму”.*

*У тэкстах захаваны арфаграфія і пунктуацыя аўтараў.*

*Жадаем вам прыемных хвілін чытання!*

*Дзяржаўная ўстанова*
*па навукова-метадычным забеспячэнні ўстаноў*
*адукацыі горада Магілёва*

# *Змест*

## *Раздзел “Мой родны кут”*


1. Касякоў Павел Аляксандравіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва” ***Прыгажосць*** ………………………………………6
2. Аскірка Алеся Вячаславаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Вальс ад завеі***……………………………………7
3. Бондар Савелій Раманавіч, вучань VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 17 г. Магілёва” ***Мая Радзіма***……..…………………….……………..9
4. Зямцова Кіра Андрэеўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 5 г. Магілёва” ***У адзінстве – наша сіла***........................................10
5. Палякоў Іван Уладзіслававіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва” ***Восень у родным краі*** ……………………………11
6. Прыстаўкіна Ксенія Дзмітрыеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 26 г. Магілёва” ***Беларускі край***…………………………12
7. Шарова Ксенія Антонаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа № 42 г. Магілёва” ***Я табой ганаруся***..………………..……………………………………………………13
8. Башарымава Маргарыта Аляксееўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская гарадская гімназія № 1” ***Мая Беларусь***…………………………14
9. Султанава Дар’я Барысаўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 25 г. Магілёва” ***Родны кут***………………..……………………..15
10. Касмачова Паліна Антонаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва” ***Гімн прыродзе***……………………………………16
11. Кучароўская Александрына Андрэеўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва” ***Беларусь ты мая***.................17
12. Васькоўская Сафія Дзмітрыеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Мая Радзіма***…………………….………18
13. Голік Аліна Максімаўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва” ***Мой Магілёў***........................................................19
14. Кузняцова Варвара Андрэеўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 3 г. Магілёва” ***Васілёк***…………………………...……………………..20
15. Ільюшэнка Марыя Вітальеўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 34 г. Магілёва” ***Мой Магілёў***……………..…………..21
16. Сізоў Цімафей Яўгенавіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Мая Беларусь***…………………..………………..22
17. Таранава Марыя Сяргееўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 25 г. Магілёва” ***Родная краіна***……………..……………………23
18. Казакова Ангеліна Дзмітрыеўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 17 г. Магілёва” ***Мая Радзіма***…………………………24
19. Церашкоў Арсеній Аляксеевіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Мой родны кут***…………………………..……….25
20. Вараб’ёў Максім Арцёмавіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва” ***Родныя краявіды***………………..……………26
21. Голубева Дар’я Аляксандраўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***Зіма ў Магілёве***……………………….28
22. Малаткова Аляксандра Дзмітрыеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва” ***Родныя краявіды***……………………..29
23. Цапік Ксенія Аляксандраўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Я так люблю свой родны кут!***………...………...30

24. Чахоўская Лізавета Андрэеўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 18 г. Магілёва” ***Анёл трымае на руках***………………….31
25. Жуйкова Соф’я Паўлаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Мой родны кут***……………………..…………32
26. Мацюха Мацвей Андрэевіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Самая лепшая ў свеце зямля***……………………33
27. Собалева Марына Ігараўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 3 г. Магілёва” ***Мой родны край***……….....................................................35
28. Красоўская Паліна Арцёмаўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва” ***Беларусь – мая краіна***..........................36
29. Шайкова Юлія Дзмітрыеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***Мой родны горад Магілёў***……………………..…37
30. Кручак Анастасія Русланаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская гарадская гімназія № 1” ***Я люблю Беларусь***……………………………..38
31. Шаранкова Дар’я Максімаўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва” ***Песня пра Магілёў***……………………..39
32. Швайкова Ксенія Андрэеўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 19 г. Магілёва” ***Мая краіна***…………………………………..……40
33. Кондалеў Марк Іванавіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Навучальна-педагагічны комплекс яслі-сад – сярэдняя школа № 44 г. Магілёва” ***Люблю сваю зямлю***……………………………………………………………………..41
34. Палякова Марына Сяргееўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 2 г. Магілёва” ***Табе, Беларусь!***………………………………….…………42
35. Кісялёў Ігар Мікалаевіч, вучань V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 39 г. Магілёва” ***Родны кут***…………………………………………43
36. Пруднікаў Раман Аляксеевіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва” ***Фарбы маёй зямлі***………………………………..44
37. Белая Анастасія Аляксандраўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва” ***Любімы куток***…………….…………..45
38. Карпенка Аляксандра Алегаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская гарадская гімназія № 1” ***Радзіма***…………………………….…46
39. Маісеенка Крысціна Дзмітрыеўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва” ***Мая радзіма***……………………………47
40. Сідаровіч Ірына Ігараўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 28 г. Магілёва” ***Абяцанне***.........................................................48
41. Лапо Арына Канстанцінаўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Журавы***……………………………………….49
42. Акуленка Ульяна Максімаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 5 г. Магілёва” ***Маёй Радзіме***…………………………..…..50
43. Галубцова Вікторыя Сяргееўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 7 г. Магілёва” ***Мой родны край***……..…………………51
44. Шубіч Аляксей Паўлавіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Вечар у вёсцы***………………………………….52
45. Лутчанкова Ганна Юр’еўна, вучаніца XI класа установы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ліцэй № 2” ***Мая краіна***………………………………………………..53
46. Ганчарова Марыя Сяргееўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Мая Радзіма***…………………………….……54
47. Куцапалава Ксенія Аляксандраўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва” ***Мая Беларусь***………………………..55
48. Анціпаў Арцём Паўлавіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва” ***Я хлопчык маленькі***……………………….56

## *Раздзел “Славутыя імёны Беларусі”*


1. Будзькова Яніна Якаўлеўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 9 г. Магілёва” ***Калі старых кніжак старонкі гартаю…***………..57
2. Картузава Ксенія Аляксандраўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва” ***Імя Ефрасінні***……………………….58
3. Собіна Альбіна Ягораўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 23 г. Магілёва” ***Памяці Максіма Багдановіча***..............................60
4. Бойчанка Валерый Дзянісавіч, вучань V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Зорка Скарыны***……………………………………62
5. Ларчанка Паліна Сяргееўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва” ***Памяці Паэта***…………………………….…..63
6. Жарын Дзмітрый Ігаравіч, вучань VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва” ***У Ляўках***……………………………………….65
7. Кубракова Віялета Сяргееўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская гарадская гімназія № 1” ***Зорка Багдановіча*** ……………………….…67


## *Раздзел “Настаўніку прысвячаецца”*


1. Магдэнка Яўгенія Сяргееўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***Любімай настаўніцы***..........................................68
2. Масейкіна Анастасія Русланаўна, вучаніца XI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва” ***Настаўніку***…………………………...69
3. Жуйкоў Барыс Паўлавіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Настаўнік вучыць нас дабру***……………………71
4. Сапроненка Вікторыя Андрэеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Настаўнікам***……………………………72
5. Старыкава Марыя Паўлаўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва” ***Слова аб першым настаўніку***……………………73
6. Пляшчэеў Арцём Сяргеевіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Навучальна-педагагічны комплекс яслі-сад – сярэдняя школа № 44 г. Магілёва” ***Першай настаўніцы***……………………………………………………………………..75
7. Бондар Маргарыта Ігараўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 28 г. Магілёва” ***Настаўніку***……………………………………...76
8. Наўрузаў Назар Цімуравіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 19 г. Магілёва” ***Настаўнікі-чараўнікі***………….……………78
9. Новікава Мілана Аляксееўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 38 г. Магілёва” ***Мой настаўнік***……………………………………79
10. Казуцін Мацвей Ігаравіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 4 г. Магілёва” ***Настаўніца першая мая***……………………………………81
11. Палазкова Лізавета Мікалаеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***Першы настаўнік***................................83


## *Раздзел “Ёсць такая прафессія – Радзіму абараняць”*


1. Вішнякоў Аляксандр Дзмітрыевіч, вучань VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва ***Мужчынам быць зусім не проста*** …….84
2. Казакоў Даніл Віктаравіч, вучань X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 18 г. Магілёва” ***Ты перамог сляпую смерць***..................................86
3. Нікіценка Алег Аляксандравіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Навучальна-педагагічны комплекс яслі-сад – сярэдняя школа № 44 г. Магілёва” ***Быць абаронцам***……………………..........................................................................................87
4. Шведаў Іван Ігаравіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва” ***Падзяка вызваленцам***..........................................................88

5. Ракоўскі Аляксандр Васільевіч, вучань VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва” ***Абаронцу***……………………………………………89
6. Фурсава Марыя Вячаславаўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва” ***Сыны беларускіх нябёс***………………………....90

## *Раздзел “Беларуская мова”*

1. Дзегцяроў Станіслаў Ігаравіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Мая мова***……………………………….............92
2. Касцянкова Марыя Андрэеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва” ***Родная мова***.......................................................93
3. Долбун Арцём Паўлавіч, вучань VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва” ***Мая мова***...........................................................94
4. Касякова Ксенія Аляксееўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Родная птушка-песня***......................................95
5. Таранава Вераніка Анатольеўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Роднай мовы клубочак***........................96
6. Таранава Марыя Сяргееўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 25 г. Магілёва” ***Мая мова***............................................................97
7. Барыгіна Ясенія Русланаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва” ***Родная мова***………………………………….....98
8. Сафонава Сняжана Сяргееўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***Маёй мове***……………………………………….99
9. Разакова Мілана Русланаўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія школа № 4 г. Магілёва” ***Словы роднай мовы***……………………….…..100
10. Селядцоў Станіслаў Канстанцінавіч, вучань VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 17 г. Магілёва” ***Мая мова***……………………………….101
11. Высоцкая Сафія Дзмітрыеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Калі ласка, кажыце на мове***............................102
12. Макеева Анастасія Уладзіміраўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 22 г. Магілёва” ***Мы ўсе забыліся, на жаль…***...............104
13. Самкова Дар’я Аляксееўна, вучаніца XI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва” ***Ганарыся мовай беларускай!***…………………..106
14. Марчанка Яўгенія Мікалаеўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва” ***Матуліна песня***……………………….107
15. Сцельмашок Юлія Алегаўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Родная мова***.......................................................108

## *Раздзел “Вершы на вольную тэму”*

1. Сацура Глеб Русланавіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Я так адчуваю мір***…………………….....…….109
2. Ленкавец Яраслава Мікалаеўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 5 г. Магілёва” ***Лес вясной***..........................................................111
3. Маркава Ганна Уладзіміраўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Дзедава памяць***……………….……..112
4. Бурак Анастасія Аляксееўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва” ***Люты***…...........................................................114
5. Аруцюнян Давід Артуравіч, вучань V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва” ***Калядная ноч***……………………………………115
6. Балашэнка Дар’я Юр’еўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа № 12 г. Магілёва” ***Лiтара***.............................................................................................................................116

7. Вераценнікава Паліна Аляксандраўна, вучаніца XI класа Ліцэя міждзяржаўнай адукацыйнай установы вышэйшай адукацыі «Беларуска-Расійскі ўніверсітэт» ***Расстанне***……………………………………………………………………………117
8. Прохараў Раман Сяргеевіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Крочыць зіма па зямлі***…………………….........118
9. Грушэцкая Ульяна Яўгенаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Свет маленства***………………………..…..119
10. Фамін Максім Вітальевіч, вучань VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Крыгаход***………………………………….……121
11. Васюк Віялета Дзмітрыеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 34 г. Магілёва” ***Снегіры***……………………………………...122
12. Пугачоў Ягор Мікалаевіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Сямейны альбом***………………………………123
13. Уласенка Дамініка Юр’еўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская гарадская гімназія № 1” ***Прыкметы восені***…………………….….124
14. Казлова Ганна Яўгенаўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва” ***Так адбываецца штогод***...................................125
15. Міхасёў Арцём Міхайлавіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Зімовы ранак***……………………..…………126
16. Маневіч Мілана Іванаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва” ***Пахаванка***.........................................................127
17. Якаўлева Ганна Андрэеўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва” ***Летняя радасць***………………………….……128
18. Крываносаў Сцяпан Аляксандравіч, вучань V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Навучальна-педагагічны комплекс яслі-сад – сярэдняя школа № 44 г. Магілёва” ***Я так адчуваю мір***............................................................................................129
19. Хрытоненка Ян Віктаравіч, вучань IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 26 г. Магілёва” ***Дабрыня сэрца***……………………………..130
20. Крыванос Крысціна Якаўлеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Новы год***.............................................131
21. Балашэнка Вераніка Уладзіміраўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Хутка***……………………………..…132
22. Міланіч Вераніка Аляксееўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 4 г. Магілёва” ***Рух, рытм, мелодыя і крокі***...........................133
23. Абраменка Ганна Яўгеньеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва” ***Зіма***………………………………………..134
24. Волк Вікторыя Андрэеўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва” ***Памяць маёй сям’і***............................................135
25. Зямлянская Ксенія Андрэеўна, вучаніца XI класа Ліцэя міждзяржаўнай адукацыйнай установы вышэйшай адукацыі «Беларуска-Расійскі ўніверсітэт» ***Шчасце любіць цішыню***………………………………………………………………...136
26. Нігамядзянава Вікторыя Вячаславаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Прырода дэкарацыі мяняе…***………..138
27. Федарэнка Ілья Дзмітрыевіч, вучань VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 45 г. Магілёва” ***Дзень адзінства***……………………………..…139
28. Чуракова Дар'я Аляксандраўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 41 г. Магілёва” ***Песня роднай прыродзе***....................................140
29. Шаршнёў Арсень Вячаслававіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва” ***Зіма***………………………………………….142
30. Шамесава Карнелія Яўгенаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Восень***................................................143

31. Цюко Карына Аляксандраўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Плача Маці-Зямля***.....145
32. Будкевіч Марыя Аляксееўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 1 г. Магілёва” ***Вясновае спатканне***.....146
33. Якаўлева Ірына Уладзіміраўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 38 г. Магілёва” ***Зімовы вечар***.....148
34. Пантаплёва Дар’я Юр’еўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 3 г. Магілёва” ***Як хораша зімою!***.....149
35. Зямцова Аляксандра Андрэеўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 5 г. Магілёва” ***Стары салдат***.....150
36. Рабцава Ганна Сяргееўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 17 г. Магілёва” ***Зіма-чараўніца***.....151
37. Сафонава Вераніка Андрэеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва” ***На горцы***.....152
38. Войтава Анастасія Дзмітрыеўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Прыгажосць***.....153
39. Смышляева Аліса Кірылаўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 7 г. Магілёва” ***Зімовы вецер***.....154
40. Чарнова Маргарыта Алегаўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Люблю…***.....155
41. Зяткіна Ксенія Віктараўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 19 г. Магілёва” ***Возера-люстэрка***.....156
42. Сімкін Дзмітрый Уладзіміравіч, вучань V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***Дзень Перамогі***.....157
43. Кандрацьеў Канстанцін Сяргеевіч, вучань VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 6 г. Магілёва” ***Сум прыроды***.....158
44. Дракіна Ганна Ягораўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Паспець бы…***.....160
45. Сіткевіч Паліна Дзмітрыеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва” ***Радзіма***.....161
46. Тхораў Арцём Міхайлавіч, вучань V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва” ***Прыгода ў лесе***.....162
47. Лаўрова Паліна Андрэеўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 2 г. Магілёва” ***Вясна***.....163
48. Пятрова Дар'я Паўлаўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 41 г. Магілёва” ***Зіма…***.....164
49. Семуценка Марыя Сяргееўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа № 12 г. Магілёва” ***Навагодні эцюд***.....165
50. Гузаў Аляксандр Вітальевіч, вучань VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Навучальна-педагагічны комплекс яслі-сад – сярэдняя школа № 44 г. Магілёва” ***Мора***.....166
51. Лунькоў Глеб Аляксеевіч, вучань X класа Ліцэя міждзяржаўнай адукацыйнай установы вышэйшай адукацыі «Беларуска-Расійскі ўніверсітэт» ***Ноч. Цішыня. Асалода***.....167
52. Каешка Аляксандр Іванавіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Беражыце прыроду***.....168
53. Чарапкова Вера Максімаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 2 г. Магілёва” ***Зіма!***.....169
54. Пятнікава Ксенія Алегаўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва” ***Пірог шчасця***.....170

55. Майстрова Ніна Андрэеўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 3 г. Магілёва” ***Хлус***………………………………………………………171
56. Храмцоў Ілья Яўгеньевіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва” ***Я хачу быць здаровым***.......................................173
57. Стэльмакова Дар’я Мікалаеўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 45 г. Магілёва” ***Зіма***......................................................174
58. Маменчыкаў Дзяніс Міхайлавіч, вучань IX VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 8 г. Магілёва” ***Пра бабулін аповед***……………………175

# *Раздзел “Мой родны кут”*

## *Прыгажосць*

*За полем лес, за лесам поле,*
*Рачулка, вёска, зноў лясок.*
*Жывецца добра на прыволлі*
*І ўецца з кветачак вянок.*

*Шматквецце ў нас на Беларусі:*
*Рамонак, люцік, зверабой.*
*Нібы разбегліся па лузе*
*І кожны хваліцца сабой.*

*Снуюць стракозы па над рэчкай,*
*Стракочуць конікі ў траве.*
*Пчаліны рой над полем з грэчкай*
*Гудзе залівіста, раве.*

*Усё гэта тут, у родным краі,*
*Такое дзіва, прыгажосць.*
*А звонкі хор птушыны ў маі!*
*Ну дзе яшчэ такое ёсць?*

*І снег зімой такі чысцюткі,*
*Аж рэжа вочы белізной.*
*Бягуць гадзіны, тыдні, суткі,*
*А я, мой край, заўжды з табой!*

*Касякоў Павел Аляксандравіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва”*

## *Вальс ад завеі…"*

*Ты ўяві сабе вальс ад завеі!*
*Ветру парыў усё ж ператварыў*
*Увесь гэты свет, што снягамі бялее,*
*У стародаўні матыў!*

*Нейкі мастак, невядомы дагэтуль,*
*Пэндзаль схапіў і бялілы набраў-*
*Стаў гэты свет палатном без багетаў,*
*Мары, надзеі ўвабраў!*

*Як на паркеце, па роўнядзі гладкай*
*Снег закружыўся, разгон набіраючы,*
*Сталі лагчынкі і ўзгоркі аладкай,*
*Ціха пад вальс засынаючы.*

*Снег сыпаў пярлінкі на плечы завеі,*
*Пацеры – нізкі ад маці-зімы,*
*І ўзнікалі аб шчасці надзеі,*
*Бляскам гарэлі яны!*

*Кружыцца, кружыцца срэбны пясочак,*
*Песціць завея  чароўны лясочак,*
*Шэрань развесіла, бы завушніцы,*
*Кожнай красуні - асінцы.*

*Дзень праміне, другі настае.*
*Крэсліць Раства ноч мінулага хібы,*
*Пыл крышталёвы да зор дастае-*
*Месяца лесвіца нібы.*

*Вось надыходзяць калядныя святкі,*
*Танчаць усе вальсы з урачыстай нагоды,*
*Разам з Казой, Буслам, Зоркай, калядкамі*
*Добры лёс  будзе народу!*

*Вальс ад завеі танцуюць сняжынкі,*
*Ціха кладуцца на дол парҡалёвы -*
*Можа праклясці ў шчасце сцяжынку*
*Кожны жыхар Магілёва*

*Аскірка Алеся Вячаславаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 35 г. Магілёва”*

## *Мая радзіма*

*Люблю цябе, мая радзіма!*
*Твае лясы, палі, лугі,*
*Блакіт і шыр тваіх азёраў*
*І збожжа жоўтыя сцягі.*

*Люблю прыгожыя абшары,*
*Дзе мяккі водар васількоў*
*Напамінае мне пра мары,*
*Жыцця майго, маіх  шляхоў.*

*Люблю я ціхі спеў крынічкі*
*І громкі клёкат жураўля,*
*Як цёмнай ноччу зоркі-знічкі*
*Ляцяць к табе, мая зямля!*

*Мая Радзіма, край цудоўны,*
*Квітней і шчасліва жыві!*
*Мой родны, мілы край чароўны,*
*Дзе столькі роднай цеплыні!*

*Бондар Савелій Раманавіч,*
*вучань VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*"Сярэдняя школа № 17 г. Магілёва"*

## *У адзінстве – наша сіла”*

*Адзіныя духам – хто побач з табою,*
*Хто разам і здольны пачуць, зразумець…*
*Адзіныя духам… Паходняй чырвонай*
*Братэрства ў нас будзе ў сэрцы гарэць.*

*Спатканні, развагі, чаканні і мары,*
*Агульныя мэты ў цікавым жыцці…*
*З’яднаныя моцным агульным жаданнем*
*Прыстойна жыццёвай дарогай ісці.*

*Сэнс кожнай хвіліны жыцця зразумеюць,*
*Падкрэсляць усё тое, што значна табе.*
*Адзіныя думкамі, духам, павагай*
*І ў шчасці, і ў горы, і ў светлай журбе.*

*Жыць роднай сям’ёй, сярод блізкіх, знаёмых,*
*З якімі цікава, прыемна заўжды,*
*Вяртацца дадому з вандровак далёкіх -*
*Без гэтага цяжка ў жыцці, сапраўды!*

*Без родных, сяброў у жыцці немагчыма,*
*Адзіным павінен быць ўвесь наш народ,*
*З’яднаным з адзінай у свеце Радзімай,-*
*І лёс нам падорыць да шчасця ўзлёт!*

*Зямцова Кіра Андрэеўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 5 г. Магілёва”*

## Восень у родным краі

*Без дарог і без сцяжынак*
*Восені той час прыйшоў.*
*У шэрых пасмах павуцінак*
*Подых свежы ён прывёў.*
*Напрамкі і стараною*
*Тут і там мастак ідзе,*
*І нябачнаю рукою*
*Фарбы яркія кладзе.*
*Фарбу з чырванню – рабіне,*
*Фарбу жоўтую – вярбе,*
*Цёмна-бурую – нізіне,*
*Охру светлую – траве.*
*Мімаходам, без аглядкі,*
*Ненарокам, проста так*
*Лісце з вецця ў беспарадку*
*Сыпле на зямлю мастак.*
*Дзесьці засталося лета,*
*За нябачнай той мяжой,*
*І адтуль струменіць светам*
*І пяшчотнай цішынёй.*

*Палякоў Іван Уладзіслававіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва"*

## Беларускі край

Сярод мноства прыгожых мясцін,
Што ў свеце пабачыць можна,
Мне мілейшы за ўсе край адзін,
Пабываць у якім можа кожны.
Беларуская прыгажосць
Вабіць вока і сэрца кранае.
Тут любы, як жаданы госць,
Край наш родны яго сустракае.
Шмат у нас ёсць буйных гарадоў
І мястэчак, далёкіх вёсак,
Што стаяць ужо колькі гадоў,
І гісторыю маюць, і лёс свой.
Тут бязмежжа зялёных лясоў,
Што сцяной небасхіл падпіраюць,
І бясконцае мора палёў,
Ні канца ў іх няма, ні краю.
А жывёл не злічыць у гаях,
Што ні лес – запаведнік, і толькі.
Птушак спеў – сэрца рвецца ў грудзях.
Жаўрукоў у паветры колькі?
Рэчак звон і азёр глыбіня,
У дождж вясёлкі пераліў каляровы,
І блакітных нябёс вышыня –
Гэта ўсё ты, мой край чароўны!

*Прыстаўкіна Ксенія Дзмітрыеўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Сярэдняя школа № 26 г. Магілёва”*

## *Я табой ганаруся*

*Край чароўны беларускі,*
*Сэрцу родная зямля,*
*Я табою ганаруся,*
*У цябе ўлюбёны я.*
*Я люблю твае палеткі,*
*Сенажаці і лясы,*
*Дзе  гудуць*
*камбайны ўлетку,*
*чуваць птушак галасы.*
*Што ні горад,*
*што ні вёска –*
*Людзі добрыя жывуць,*
*Як суседзі, па-сяброўску*
*І працуюць, і пяюць.*
*Я табою ганаруся,*
*У цябе ўлюбёны я.*
*Край мой родны беларускі,*
*Сэрцу родная зямля.*

*Шарова Ксенія Антонаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “ВПК дзіцячы сад – сярэдняя школа № 42 г. Магілёва”*

## *Мая Беларусь*

*Пасярод жывапісных балот і лясоў,*
*Між блакітных азёр і сасновых бароў,*
*Рассцілаецца край невядомы, таемны*
*І таксама дзівосны, цудоўны, прыемны…*

*Салаўіныя песні гучаць навакол,*
*І прыгожа пяе на дубочку шчыгол.*
*Гаварлівы і жвавы бяжыць ручаёк,*
*І ляціць над зялёным лужком матылёк.*

*Прыгажуня вавёрка лушчыць арэхі*
*І прыплясвае весела дзеля пацехі.*
*Над палямі буслы ганарліва ляцяць,*
*І валошкі ў пшаніцы красуюць, шумяць.*

*(Ціхамірнай) Дружалюбнай краіна наша названа,*
*І дзяржаву насельніцтва любіць аддана.*
*Прыгажосцю краіны я ганаруся!*
*А завецца чароўна яна Беларуссю!*

*Башарымава Маргарыта Аляксееўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Магілёўская*
*гарадская гімназія № 1"*

## *Родны кут*

*Бясконцасць лугоў, твань балотнай імшары,*
*Абрысы сівых камянеў, што застылі, бы твары,*
*Бязмежнасць нябесаў і сінь васількоў,*
*Крынічка ў лузе і клекат буслоў.*
*Вялізная ліпа, сцяжынка і ганак –*
*Тут я сустракаю свой вечар і ранак.*
*Прытулак у хаце ты знойдзеш заўседы,*
*Душой адпачнеш ад вяселай прыгоды.*
*Частуе бабуля блінамі ды чаем,*
*Як добра, прыемна сябе адчуваем!*
*Дзядуля да мышкі занес мой зубок,*
*Тут я зрабіла першы свой крок.*
*І матчына слова – такое раднoе*
*Кранае пяшчотай душу за жывое.*
*Так хочацца мне, як я стану бабуляй,*
*Каб дзеці і ўнукі тое ж адчулі.*
*Шчаслівая я і тым ганаруся –*
*Што нарадзілася ў Беларусі.*

*Султанава Дар'я Барысаўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 25 г. Магілёва"*

## *Гімн прыродзе*

*Я радуюся цёпламу дзяньку.*
*Ён так падобны летняму настрою!*
*Люблю памарыць ціхенька ў цяньку,*
*Падыхаць незабыўным кветкавым напоем.*

*Люблю журчанне ручая, бярозак цень,*
*Крыштальна чыстую ваду крыніцы,*
*З якой у спякотны летні дзень*
*Вадою смачнай можна наталіцца.*

*Люблю прыроду. Гэта – цэлы свет*
*Эмоцый, красак, колераў, жаданняў.*
*Валошкі, канюшына, дзьмухавец.*
*І шчасце жыць з прыродай у яднанні!*

*Касмачова Паліна Антонаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 11 г. Магілёва”*

## *Беларусь ты мая*

*Беларусь мая, родная маці мая!*
*Я часцінка твая, я крывінка твая.*
*У бары і ў полі – сцяжынка твая,*
*У чыстым лузе прасторным квяцінка твая.*
*Ноччу зорка ў небе – і зноў гэта я,*
*Ветка яблыні я, я і спеў салаўя,*
*Я расінка на траўцы, саломка жніўя,*
*Быць заўсёды з табой- гэта мара мая.*
*Ты паклічаш мяне, і гукну цябе я -*
*Зазвініць, запяе, заіскрыцца зямля!*
*Гэта шчасцем завецца! Люблю цябе я,*
*Беларусь ты мая! Беларусачка я!*

*Кучароўская Александрына Андрэеўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 21 г. Магілёва”*

## *Мая Радзіма*

*Мой родны кут! Мой любы і прыгожы!*
*Тут нарадзілася і тут жыву.*
*Ён даражэй за  ўсё, інакш і быць не можа,*
*Таму я смела па жыцці іду.*

*Тут палёў зеленеюць прасторы,*
*Над лугамі стаіць дзіўны пах.*
*Не патрэбны далёкія моры.*
*Хай лунае наш бусел – наш птах.*

*Люблю цябе за прыгажосць, за шчырасць,*
*За мужнасць і цяпло твае.*
*Для нашага народа гэту міласць*
*Краіна родная дае.*

*Ты гучы, мая родная мова,*
*І квітней, дарагая зямля,*
*Каб шырокія нашы прасторы*
*Бачна было ўсім здаля!*

*Васькоўская Сафія Дзмітрыеўна,*
*вучаніца ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 33 г. Магілёва"*

## *Мой Магілёў*

*Мой родны горад, горад Магілёў,*
*Узвышаецца над нашаю зямлёю.*
*Узрост свой лічыць сотнямі гадоў,*
*Я ганаруся, горад мой, табою.*

*Заўсёды ты прыгожы, Магілёў,*
*Зімой і ўлетку ты для ўсіх жаданы.*
*Ты людзям аддаеш сваё цяпло,*
*Цяпло сустрэч і радасці спатканняў.*

*Мой родны горад, прызнаюся я табе:*
*Люблю цябе сваім гарачым сэрцам.*
*І думаю: нічым і анідзе*
*Любоў мая ніколі не сатрэцца.*

*Голік Аліна Максімаўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва"*

## *Васілёк*

*Лета. Ліпень. Сонца зіхаціць.*
*Жыта ў полі золатам гарыць.*
*Я ў жыце васілёк знайшла…*
*Ён такі прыгожы – нездарма прыйшла.*

*На мяне ён вочкамі глядзіць*
*І ад страху ўвесь калоціцца, дрыжыць.*
*– Не хвалюйся. Я не буду цябе рваць,*
*Каб ты іншых змог парадаваць…*

*У Беларусі шмат дзе васількі растуць.*
*Іх таму па-рознаму завуць:*
*Тут валошка з сінявецтам, там – блаватэк, лазурак.*
*І расце ён на палетках, сінявокі наш зямляк.*

*Кузняцова Варвара Андрэеўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Гімназія № 3*
*г. Магілёва"*

## *Мой Магілёў*

*Зноў да цябе, мой дарагі,*
*З любоўю, дабрынёй, пяшчотай.*
*Ты для мяне адзін такі,*
*Мой Магілёў, мой горад родны!*
*Прыроды кожная пара*
*Ў тваіх абдымках непаўторна,*
*І вобраз паднікольскага двара*
*Мастак выводзіць на палотнах.*
*Тваіх сабораў і царквей*
*Нябачны свет нас пакрывае,*
*А мноства плошчаў і алей*
*Натхненнем сэрца акрыляе.*
*Калі, гуляючы, праходжу*
*Па вуліцах тваіх пустынных,*
*У сваіх думках я знаходжу*
*Твой вобраз той, яшчэ былінны.*
*І сэрца ціхенька трымціць,*
*Ад захаплення замірае,*
*Ад усіх нягод душа баліць,*
*За доблесць гонар напаўняе.*
*Любуюся я чысцінёй тваёй*
*І паўтараю раз за разам:*
*"Прыгожы горад! Мой Магілёў!*
*Ты наш набытак. Ты шчасце наша!"*

*Ільюшэнка Марыя Вітальеўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 34 г. Магілёва"*

## *Мая Беларусь*

*Я тут нарадзіўся,*
*І я ганаруся:*
*Няма лепш зямлі*
*За маёй Беларусі!*
*А музыкі колькі*
*У назве краіны!*
*Цымбал пераразвон тут*
*І клёкат буслiны,*
*І жаўранкаў спеў*
*Раніцой напрадвесні,*
*І ласка, пяшчота*
*Матулінай песні.*
*Прыгожым прасторам тваім*
*Я дзіўлюся…*
*Я рады таму,*
*Што жыву ў Беларусі!*

*Сізоў Цімафей Яўгенавіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва"*

## *Родная краіна*

*Мой родны кут, мая краіна,*
*Твае жывёлы і расліны,*
*І краявіды, і прасторы,*
*Раўніны і дарог узоры,*

*Пасёлкі, гарады, падвор'і,*
*у спёку, сцюжу – пры любым надвор'і*
*Натхненне дораць мне штодня*
*Народ твой і твая зямля.*

*Я з малых лет малюю ўсюды.*
*Я мару, што мастачкай буду.*
*Таму гляджу вакол я пільна,*
*Каб больш дакладна на карцінах*

*Тваю красу ўсім паказаць*
*І непаўторнасць перадаць.*
*Я, беларуская дзяўчына,*
*Люблю цябе, мая краіна!*

*Таранава Марыя Сяргееўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 25 г. Магілёва"*

## *Мая Радзіма*

*Мая Радзіма-луг шырокі*
*Духмяныя стагі на ім.*
*Мая Радзіма –высь аблокаў*
*У ззянні сонца залатым.*

*Вакол красуюцца палеткі.*
*Жытнёвы колас  як сцяна.*
*Тут  дзе-нідзе сінеюць кветкі*
*(Радзімы сімвал)  васілька.*

*Шуміць высокі лес зялёны.*
*Бярозак белых карагод.*
*Сустрэнеш ясені і клёны*
*І дуб магутны ў сотню год.*

*Блакіт азёр чаруе вочы*
*Тут стужкі рэчак у чаратах.*
*І з раніцы да позняй ночы*
*Клякоча бусел – родны птах.*

*Казакова Ангеліна Дзмітрыеўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 17 г. Магілёва”*

## *Мой родны кут*

*Мой родны кут,*
*Мая Радзіма,*
*Няма ў свеце*
*Прыгажэйшай…*
*Мая блакітная краіна,*
*За ўсіх ты лепшая і даражэйшая!*

*Твае глыбокія азёры,*
*Твае бясконцыя лясы …*
*Твае зялёныя прасторы,*
*Кранаюць сэрца,*
*Гук душы …*

*Жыві, квітней,*
*На радасць людзям!*
*Мая радзіма Беларусь!*
*Я беларус і прызнаюся:*
*Сваёй краінай ганаруся!*

*Црашкоў Арсеній Аляксеевіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва"*

## *Родныя краявіды*

*Ледзь прыкметная сцежка віецца*
*І выводзіць мяне на ўзгорак.*
*У небе весела сонца смяецца,*
*З вышыні пазірае наўкола.*

*Шлях ляжыць каля гулкай рачулкі,*
*Па каменьчыках шпарка што скача,*
*І яе пералівы і булькат*
*Чуць здалёк можа кожны і бачыць.*

*Па абодва бакі ад рачулкі*
*Вербалоз нахіліў сваё голле.*
*Маладзенькія сосны і елкі*
*Побач з ёю растуць на прыволлі.*

*За рачулкаю лес выступае,*
*Быццам цёмны ўзвышаецца хорам,*
*Гэтак велічна ён паглядае*
*На шырокія межы прастору.*

*А навокал – лугі і палеткі,*
*Лес гасцінна запросіць пад шаты.*
*І ў полі духмяныя кветкі*
*На салодкі ласунак багаты.*

*І палеткі, і лес, і рачулка*
*Для мяне – даражэйшыя ў свеце.*
*Ускалыхваюць памяць і гулка*
*Адбіваюцца гукамі ў сэрцы.*

*Краявіды маёй Беларусі*
*След у сэрцах людскіх пакідаюць,*
*Закахацца навечна прымусяць,*
*І душы ні адной не мінаюць!*

*Вараб'ёў Максім Арцёмавіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва"*

## *Зіма ў Магілёве*

*Крадком ішла зіма ў горад,*
*Бяліла скверы і масты,*
*Пускала ўсюды сіні холад,*
*Вяла з сабою маразы.*

*Увабралася зіма ў сілу,*
*Падзьмула сіверам уначы,*
*Аж нават рух перапыніла*
*Жывой вады, што ў Дняпры.*

*Пайшла гуляць па Падміколлі,*
*Прабегла паркі з вецярком,*
*Пакрыла шэранню ўсё голле,*
*Сумёт надзьмула пад камлём.*

*Над Ратушай кружыла доўга,*
*Старанна трэсла тоўсты мех,*
*Каб дзень і ноч нібыта з рога*
*Ўсё падаў, падаў белы снег.*

*Нарэшце на двары ўсё сціхла:*
*Віхура выбілася з сіл.*
*Заззяла ў небе сонца зырка,*
*Сагрэла горад, што мне міл.*

*На горкі цягнуць санкі дзеці,*
*Лядзянкі, цюбінгі, канькі.*
*Імчаць шчаслівейшыя ў свеце*
*Магіляўчане нацянькі.*

*Голубева Дар'я Аляксандраўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва"*

## *Родныя краявіды*

*Я жыву ў Беларусі –*
*Гэтым вельмі ганаруся!*
*Шыр палёў, блакіт азёр,*
*І ў пушчы – шмат зуброў.*

*Бусел белымі крыламі*
*Зямлю нашу абдымае.*
*А высока ў паднябессі*
*Жаўрукі спяваюць песні.*

*Сонейка ў небеззяе,*
*У полі жыта паспявае.*
*Усё навокал сэрцу міла –*
*Бо гэта ўсё – мая Радзіма!*

*Малаткова Аляксандра Дзмітрыеўна,*
*вучаніца ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва”*

## *Я так люблю свой родны кут!*

*Я так люблю свой родны кут,*
*Дзе нарадзілася калісьці,*
*І маці песні мне спявала тут,*
*Люляючы мяне ў калысцы.*

*Вясну люблю ў сваёй старонцы,*
*Калі з вышынь грукоча гром,*
*І з хмар вясёлых дождж звонкі*
*Вяртае з вуліцы ў дом.*

*Люблю я голас звонкі лета,*
*Калі ў небе жаўрукі*
*Звіняць, як золата палеткаў,*
*І дзень пагодлівы такі!*

*Люблю, калі шчадруе восень,*
*Калі мы лічым ураджай,*
*Рупліва ў засекі заносім*
*Усё тое, што нам дорыць край!*

*Люблю зіму з бялюткім снегам,*
*Што ўсю наўкол пакрыў зямлю.*
*Забавы зімнія са смехам,*
*Раство з Калядамі люблю!*

*Любоў да роднае старонкі,*
*У душы ўсё болей з году у год,*
*Нібы каштоўная скарбонка*
*Якую перадаў мой род!*

*Цапік Ксенія Аляксандраўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва"*

## *Анёл трымае на руках*

*Анёл трымае на руках*
*Чароўны горад мой і твой,*
*Трымае ўдзень, трымае ў снах,*
*Даруе шчасце і спакой.*
*Анёл спявае па начах*
*Нязгасным сонцам увышыні,*
*І ззяюць зорачкі ў вачах,*
*Звіняць надзеяй у цішыні.*
*Бяжыць Дняпро, спыняе ход*
*Каля праслаўленай гары.*
*Сняжынак дружны карагод*
*Кружыць за вокнамі, у двары.*
*Анёл люляе горад мой,*
*Нібы любімае дзіця,*
*Натхняе марай залатой*
*Штоноч, штоўвечары, штодня*
*Ствараць, а не прымаць свой лёс,*
*Ісці праз час без страху дзён,*
*І голас чуць Святых Нябёс,*
*І мець ад думак дзіўных плён,*
*І шчасце мець, і шчасцем жыць,*
*Па вулках крочыць, і кахаць,*
*На небе зоркі падлічыць,*
*І лепшую з усіх аддаць*
*Мястэчку, дзе шуміць Дняпро*
*І ля гары спыняе ход*
*І дзе анёлава крыло*
*Засцерагае з году ў год.*

*Чахоўская Лізавета Андрэеўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 18 г. Магілёва”*

## *Мой родны кут*

*Мой родны кут жыве ў казках,*
*З дзяцінства памятаю іх.*
*Жыве ён ў бацькоўскіх ласках,*
*У вачах бабуль-дзядуль маіх.*

*Мой родны кут жыве ў паданнях,*
*У вежах нашых гарадоў,*
*Жыве ў велічных курганах,*
*У чысціні лясоў-бароў.*

*Мой родны кут жыве ў адзінстве*
*Усіх беларускіх жыхароў:*
*Тых, хто жыве ў сталіцы – Мінску,*
*У мностве вёсак, гарадоў.*

*Мой родны кут жыве ў продках,*
*У подзвігу бацькоў-дзядоў,*
*У памяці маёй і аднагодкаў,*
*У Брэсцкай крэпасці святой!*

*Мой родны кут жыве ў людзях,*
*Што славяць Беларусь штодня.*
*Няхай заўсёды гэтак будзе:*
*Жыві-квітней, мая зямля!*

*Жуйкова Соф'я Паўлаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 43 г. Магілёва"*

## *Самая лепшая ў свеце зямля*

*Родны край дарагі,*
*Край азёр і дуброў,*
*У летнім лузе стагі,*
*У пушчах – статкі зуброў.*
*Самая лепшая ў свеце зямля –*
*Беларусь мая.*

*У сінім небе гучыць*
*Зычны крык жураўля,*
*А ў садах усё звініць*
*Звонкі спеў салаўя:*
*«Самая мілая ў свеце зямля –*
*Беларусь мая».*

*Колькі горасных дзён*
*Нам прынесла вайна.*
*Ды ў фашысцкі палон*
*Ты не здацца змагла,*
*Самая мужная ў свеце зямля –*
*Беларусь мая.*

*Паў-Еўропы ў вайну*
*Прадзед мой вызваляў.*
*І зімой, і ўвясну*
*Як жа ён успамінаў:*
*«Самая родная ў свеце зямля –*
*Беларусь мая».*

*Калі ж прыйдзецца мне*

*У край чужы ад'язджаць,*
*І на яве, і ў сне*
*Мяне будзе чакаць*
*Самая любая сэрцу зямля –*
*Беларусь мая.*

*Мацюха Мацвей Андрэевіч,*
*вучань ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва”*

## *Мой родны край*

*Мой родны край – сцяжынка к дому.*
*На ёй - бялюсенькі сняжок.*
*Мой родны край – бярозка ў полі,*
*У далонях жытні каласок.*
*Мой родны край – лясы, узгоркі*
*І спевы птушак у цішы.*
*Мой родны край – Дняпро шырокі*
*І промні сонца ў вышыні.*
*Мой родны край- мой родны горад,*
*Прыгожы восенню і ў май.*
*Цябе люблю, табой жыву я,*
*Чароўны магілёўскі край!*

*Собалева Марына Ігараўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*Гімназія № 3 г. Магілёва"*

## *Беларусь – мая краіна*

*Беларусь – мая краіна,*
*Беларусь – мая зямля!*
*Майму сэрцу ўсё тут міла –*
*Рунь і першая ралля.*

*Ну, а людзі Беларусі?*
*Працавіты наш народ.*
*Пад прыгнётам нізка гнуўся,*
*Перажыў ён шмат нягод.*

*Коні чужакоў тапталі*
*Сенажаці і палі.*
*Танкі з чорнымі крыжамі*
*З захаду на ўсход ішлі.*

*Толькі гэтага ўсё мала…*
*І чарнобыльскі палын*
*Хмарай радыятуману*
*Зацягнуў нябёсаў сінь.*

*Ні бядоты, ні нягоды*
*Не зламілі мой народ:*
*Мы жывём у міры, згодзе,*
*Шчасным будзе кожны год!*

*Беларусь, мая Радзіма,*
*Быццам кветка, расцвіла.*
*Ты квітней, мая краіна!*
*Ты жыві, мая зямля!*

*Красоўская Паліна Арцёмаўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 27 г. Магілёва”*

## *Мой родны горад Магілёў*

*Мой родны горад над Дняпром-*
*Крыніца маіх мар.*
*Ты мой адзіны родны дом,*
*Не ведай бур і хмар!*

*Твой лёс спрадвеку слаўным быў,*
*Як лёс маіх дзядоў.*
*Не толькі ў росквіце ты жыў,*
*Лілася тут і кроў.*

*Гісторыя краіны ўсёй*
*не абышла цябе.*
*Адданых колькі тут сыноў*
*Палегла ў барацьбе!*

*Навалай на цябе ішлі*
*Француз і немец, швед.*
*Скарыць наш горад не змаглі,*
*Хоць шмат нанеслі бед.*

*Гасцінным ты заўсёды быў*
*Сто, дзвесце год таму.*
*І імператар, і паэт*
*Нам сведкамі таму.*

*Квітней жа, радасна жыві,*
*Штогод ты прыгажэй!*
*Наш любы горад Магілёў*
*Усіх месцаў даражэй!*

*Шайкова Юлія Дзмітрыеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 15 г. Магілёва”*

## *Я люблю Беларусь*

*Я люблю Беларусь,*
*Ганаруся я ёй!*
*Лепей у свеце няма*
*Зямлі роднай маёй!*

*Я люблю Беларусь,*
*Колас буйны ў палях,*
*Гул камбайнаў вакол,*
*Сенакос на лугах!*

*Я люблю Беларусь,*
*Край азёр, край лясоў,*
*Спевы птушак у гаях,*
*Квецень нашых садоў!*

*Я люблю Беларусь,*
*Васількі паўз дарог,*
*Водар бэзу ў садах,*
*Шаўкавісты мурог!*

*Я люблю Беларусь,*
*Я люблю свой народ!*
*Працавіты такі,*
*Бачыў шмат ён нягод.*

*Я люблю Беларусь,*
*Край бацькоў і дзядоў!*
*Тут Радзіма мая,*
*Тут мой лёс і любоў!*

*Кручак Анастасія Русланаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*"Магілёўская гарадская гімназія № 1"*

## *Песня пра Магілёў*

*Я свой крок павярну*
*У бязмежжа лугоў*
*І паветра ўздыхну*
*Ад дняпроўскіх вятроў.*

*І пяшчотны струмень*
*Растрывожыць спакой.*
*Стане казачным дзень,*
*Заіскрыцца настрой.*

*Ты мой край дарагі,*
*Скрозь – сасновы дурман,*
*Сакаўныя лугі*
*І жытнёвы туман.*

*Я паклон табе шлю ,*
*І шапчу "дзякуй" зноў*
*За трывaласць тваю,*
*Родны мой Магілёў!*

*Выткан славай твой шлях,*
*Што ні крок – то святыня.*
*У крывавых баях*
*Гартаваў свае сілы.*

*Пад святочным агнём,*
*Без варожых акоў,*
*Пад бусліным крылом*
*Ты квітней, Магілёў!*

*Шаранкова Дар'я Максімаўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва"*

## *Мая краіна*

*Мой родны кут, мая Радзіма!*
*Мая краіна Беларусь!*
*Я нарадзіўся тут і вырас,*
*І вельмі гэтым ганарусь.*

*Народ мой чулы, талерантны,*
*Які прайшоў праз шмат нягод.*
*Ён вынес голад і разруху,*
*Боль страт вайны,*
*Знаў шмат турбот.*

*Народ мой моцны, ён не здаўся,*
*Усе пакуты перамог.*
*Расправіў плечы і падняўся,*
*Бо па-йнакшаму не мог.*

*Ён усміхацца навучыўся,*
*Без асцярогі жыць, ствараць, кахаць*
*Сваёй Радзімай ганарыцца,*
*Сваю Краіну ўсхваляць.*
*Не забываць пра подзвіг дзедаў,*
*А ўсё што маем – шанаваць.*

*Мой родны кут, мая Радзіма!*
*Мая краіна Беларусь!*
*Я нарадзіўся тут і вырас,*
*І вельмі гэтым ганарусь.*

*Швайкова Ксенія Андрэеўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 19 г. Магілёва”*

## *Люблю сваю зямлю*

*Люблю сваю зямлю: лугі ў кветках,*
*Лясы, палі, прыгожыя світанні.*
*Люблю шум дрэў і ветру гул улетку,*
*І гучны гром, і бліскавіц міргание.*

*Люблю вясёлку ў небе і аблокі,*
*Сцяжыначку лясную між барамі…*
*І сонейка святло, і дуб стары, высокі,*
*І лісця восеньскага шэлест пад нагамі*

*І цішыню ўначы, і песні салаўя,*
*І шматгалосы меладычны звон ракі.*
*Усе тое, што і ёсць мая зямля,*
*Што для меня завецца «кут мой дарагі»*

*Кондалеў Марк Іванавіч,*
*вучань ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "НПК яслі-сад – сярэдняя школа № 44 г. Магілёва"*

## *Табе, Беларусь!*

*Беларусь мая родная, сэрцу*
*любы, чароўны мой край!*
*Я даўно закаханая ў квецень*
*прывольную, у твае пушчы,*
*бярозавы гай!*
*Ты такая цудоўная, шчырая,*
*з ціхім клёкатам старых буслоў!*
*Ты, Радзіма мая адзіная,*
*край легенд і пяшчотных слоў!*
*Твае сінія рэкі, азёры,*
*нібы вочы, на сонцы блішчаць,*
*а якія прывабныя зоры*
*ціхай раніцай тут зіхацяць!*
*Як у лесе ўтульна тваім,*
*нібы кралі, суніцы гараць!*
*І вавёрку, і воўка сустрэнеце ў ім,*
*песні птушак заўсёды чуваць!*
*А на ўзгорку, ля самай рэчкі,*
*глянь: бярозкі, вядуць карагод.*
*Водар, ціш, пахне грэчка,*
*ціха пчолкі збіраюць мёд.*
*Як у люстру, глядзяцца зоры,*
*у нябесную ціш вады,*
*і на сэрцы такая лагода…*
*Я, Радзіма, з табой назаўжды.*

*Палякова Марына Сяргееўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Гімназія № 2 г. Магілёва*

## *Родны кут*

*Прырода мілае старонкі*
*Уражвае мяне заўжды:*
*Калі ў небе сонца грэе,*
*Калі ў полі маразы.*
*Калі вясноваю парою,*
*Вяртаюцца дамоў шпакі,*
*Калі ўвосень у небе нізкім,*
*Лятуць у вырай жураўы.*
*Калі прырода ажывае*
*Ад зімніх сцюжаў і ад сну,*
*Пралеска ў лесе ўзнікае,*
*З сабою ведучы вясну.*
*Калі ад інею бярозы*
*Стаяць прыгожа, нібы цуд,*
*Я разумею, што шчаслівы,*
*І ганаруся: "Тут мой кут!"*

*Кісялёў Ігар Мікалаевіч,*
*вучань V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 39 г. Магілёва"*

## *Фарбы маёй зямлі*

*Бацька пытае ў мяне: "Адкажы,*
*Колераў колькі ў роднай зямлі?*
*Глянь ты наўкола і мне раскажы".*
*Я разважаю пра фарбы зямлі:*
*- Колер зялёны – лясы і лугі,*
*Сіняга колеру ўсе васількі,*
*Колер блакітны – неба і рэкі,*
*Жоўтага колеру – жыта снапкі.*
*Вось белы колер – букецік рамонкаў,*
*Бусел над полем, аблокі ў небе.*
*Белая вопратка нашых людзей*
*І валасы маленькіх дзяцей.*
*Колер чырвоны – радасць і шчасце.*
*Людзі жывуць без усякіх напасцяў.*
*Любім гукаць мы вясёлых гасцей.*
*Хай прыязджаюць да нас усе хутчэй.*

*Пруднікаў Раман Аляксеевіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва"*

## *Любімы куток*

*Уецца сцяжынка скрозь поле і гай.*
*Гэта Радзіма – любімы мой край.*
*Вось праз рачулку малую масток.*
*Гэта мой самы любімы куток.*
*Неба высокага чысты блакіт*
*У кропельку кожную ціха глядзіць.*
*Бэзавы водар ад ручая –*
*Месца, дзе родная хатка мая.*
*Пушчы, лясы і бязмежныя далі –*
*Дом, дзе мяне заўсёды чакалі.*
*Лепшая ў свеце святая зямліца.*
*Месца, дзе мне давялось нарадзіцца.*

*Белая Анастасія Аляксандраўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 46 г. Магілёва”*

## ***Радзіма***

*Радзіма мая  беларуская!*
*У сэрцы маім ты навекі!*
*Бацькоўская хата. Сцяжыначка вузкая…*
*Успаміны дзяцінства як лекі!*

*Радзіма мая  старажытная!*
*У паданнях, легендах апета.*
*І песня твая самабытная*
*Каханнем і шчасцем сагрэта.*

*Радзіма мая  гераічная!*
*Ты войны і здзекі сцярпела.*
*Староначкі лёсу трагічныя*
*Гартаю ў думках нясмела.*

*Радзіма мая  светлая!*
*Вялікае Сонца ў свеце.*
*Ты, мара мая запаветная !*
*Хай славяць цябе твае дзеці!*

*Карпенка Аляксандра Алегаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Магілёўская гарадская гімназія № 1”*

## Мая радзіма

*Кут родны мой, мая радзіма,*
*Азёры, рэчкі і палі –*
*Усё мне гэта сэрцу міла,*
*Не знойдзеш лепей на зямлі.*

*Утульны дворык, тын пахілы,*
*Малое дрэўца, кветка, куст.*
*І сцежка, што вядзе да школы,*
*А пад нагамі жоўты ліст.*

*Духмяны водар на світанку,*
*Птушыны спеў і цішыня…*
*І вось стаю я зноў на ганку –*
*Вакол спакой і цішыня.*

*Прыемна ўлетку ранкам росным*
*Грыбоў у лесе назбіраць,*
*А потым радасным, лагодным*
*Палёт птушыны назіраць.*

*Любіце, людзі, край свой родны,*
*Шануйце матчыну зямлю!*
*Яна даруе вам штодзённа*
*Надзею, веру, дабрыню.*

*Маісеенка Крысціна Дзмітрыеўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва”*

## *Абяцанне*

*Цёплае сонейка свеціць так гожа,*
*З сіняга неба глядзіць звысака.*
*Усё наваколле красуе прыгожа!*
*Мая Беларусь, як ты мне дарага!*

*Люблю я свой горад і сябраў сваіх,*
*Люблю я палі, і лясы, і сады!*
*Таму і жыву я заўсёды вясёлай,*
*Хоць невялікія маю гады.*

*Мінаюць часы, і я стану дарослай,*
*Пакуль я ў трэцім толькі вучусь.*
*Я буду стараннай, добрай, сумленнай*
*І працай праслаўлю маю Беларусь!*

*Сідаровіч Ірына Ігараўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 28 г. Магілёва”*

## *Журавы*

*Охрай светлай восень піша сад,*
*І за горадам гаёчкі запалалі,*
*На дарогах скрозь лісточкі шапацяць:*
*Учора іх бярозкі пагублялі.*

*А сягоння ў сівы туман*
*Журавы таропка адлятaлі,*
*Разрывалі хмары папалам,*
*У далёкі шлях*
*З сабой кагосьці звалі.*

*Мы крычалі гучна:*
*“Журавы!*
*Не ляціце, будзьце разам з намі!”*
*Толькі не пачулі нас яны,*
*Заглушыла восень крык даждж амі…*

*Толькі ведаем, што зноў вясной*
*Вернуцца – яны заўжды такія.*
*Ім чужына – толькі зімаваць,*
*Берагі Дняпра – вось іх стыхія!*

*Лапо Арына Канстанцінаўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 33 г. Магілёва”*

## *Маёй Радзіме*

*Блакітнае неба з буслямі,*
*Прыгожыя пушчы, бары…*
*Усё гэта наша краіна,*
*Наш дом – маладыя і стары.*

*Асілкі дубы і блакітныя рэкі,*
*Густыя лясы і палі,*
*І помнікаў гмахі – маўклівыя сведкі*
*Гісторыі нашай, жыцця і вайны.*

*За ўсё нашым продкам змагацца прыйшлося –*
*За долю і волю, за шчасце сваё.*
*Шмат цяжкіх гадоў пераджыць давялося,*
*Каб род не сышоў у небыццё.*

*Падзяку ў сэрцы мы несці павінны*
*І памятаць усіх змагароў і байцоў.*
*Жывіце надзеяй і марай адзінай*
*І не шкадуйце спагадлівых слоў!*

*Акуленка Ульяна Максімаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 5 г. Магілёва"*

## *Мой родны край*

*Мой родны край, мая старонка,*
*Мілей цябе на свеце не знайсці.*
*Тваю я назву паўтараю звонка –*
*Няхай гучыць яна па ўсёй зямлі.*
*А назва простая, і кожнаму знаёма,*
*Калі б глухі, і той пачуў яе.*
*З любоўю і натхненнем паўтару я:*
*Мой мілы кут, Радзіма, Беларусь.*
*Дзе свеціць сонца над шырокім полем,*
*Цвітуць сады і разліваецца Дняпро,*
*Сцяной высокаю шумяць дубровы,*
*І сэрца тут маё спакой знайшло.*
*Мой родны кут, мая старонка –*
*Ніколі не забыць цябе імкнуся.*
*Тваю я назву паўтараю звонка,*
*З глыбокім сэнсам назву – Бе – ла – русь!*

*Галубцова Вікторыя Сяргееўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 7 г. Магілёва”*

## *Вечар у вёсцы*

*Ціхі вечар у вёсцы...*
*Водар канюшыны…*
*Побач дзед з бабуляй,*
*Колкі куст шыпшыны.*

*Ластаўкі ў небе*
*Пачалі лятаці.*
*Заўтра трэба ў полі*
*Дзеду памагаці.*

*Вось на небе зоркі*
*Ясна засвяцілі,*
*Матылі кружацца*
*Каля ліхтара.*

*Гэты час цудоўны*
*Мне да сэрца мілы,*
*Але спаць лажыцца*
*Надышла пара.*

*Шубіч Аляксей Паўлавіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 31 г. Магілёва”*

## *Мая краіна*

*Люблю я роднае мястэчка,*
*Завецца Хоцімскам яно.*
*Там ёсць палі, і лес, і рэчка.*
*Ланцуг жыцця – звяно.*

*Я там зрабіў свой першы крок,*
*Хадзіў у сад, у школу.*
*Там атрымаў і першы свой урок,*
*Знайшоў сяброў я новых.*

*Шмат усяго там перажыта:*
*І боль, і першае каханне…*
*Пазнаў балючае расстанне!..*
*Было ўсё не са мной*
*нібыта.*

*Але ж люблю я той куток,*
*Ўспамін хвалюе сэрца.*
*Пячэ гарачых слёз струмок –*
*З вачэй на волю рвецца.*

*Сумую, Хоцімск, па табе…*
*Не забывай і ты мяне.*

*Лутчанкова Ганна Юр'еўна,*
*вучаніца XI класа*
*установы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны*
*ліцэй № 2"*

## *Мая Радзіма*

*Мая сінявокая, добрая, мілая,*
*Вельмі прыгожая, шчыра любімая.*
*Быццам матуля лагодна ласкае,*
*Пяшчотна да сэрца нас прытуляе.*
*Гора і боль перанесла краіна,*
*Стала мацней, галаву не схіліла.*
*Мужнасць герояў – вялікая сіла,*
*Гэта зямля наша іх нарадзіла.*
*Хоць яшчэ мала гадоў я пражыла,*
*А хараство Беларусі знайшла:*
*Рэкі, азёры, звоны крыніц,*
*Шчэбеты птушак, лес таямніц,*
*Наш працавіты і мірны народ,*
*Край наш квітнее з году ў год.*
*Хай прыгажэе дзень ада дня,*
*Я ганаруся табою, зямля!*
*Я не дазволю ўсё гэта парушыць,*
*Толькі ўперад з табой буду рушыць.*
*Родны свой кут назаўжды не пакіну,*
*Маці-краіну ніколі не кіну!*

*Ганчарова Марыя Сяргееўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва”*

## *Мая Беларусь*

*Люблю прыроду Беларусі*
*З такою зменлівай красой.*
*Дадому  прылятаюць гусі*
*Цудоўнаю парой – вясной.*

*Узімку ўсё прыбралася ў срэбра:*
*Палі, лугі, рака і лес.*
*Разныя зоркі скрозь ажурам*
*Ляцяць, зіхцяць, спяшаюцца з нябёс.*

*Увосень тут буяюць фарбы:*
*Чырвань, сінь, блакіт.*
*І разбаўляе злата цудаў*
*Зялёных елак малахіт.*

*Улетку каласіцца жыта,*
*Пад сонцам мірным шэпча гай.*
*Расой святой зямля паліта.*
*Шануйце, людзі, родны край!*

*Куцапалава Ксенія Аляксандраўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 11 г. Магілёва”*

## *Я хлопчык маленькі*

*Я- хлопчык маленькі*
*Гадоў толькі восем.*
*Зімой нарадзіўся, але люблю восень.*
*Люблю я вучыцца і вершы складаць.*
*На мове бацькоўскай хачу напісаць.*
*Яна мілагучная, шчодрая мова.*
*Ад самага сэрца ідуць мае словы.*
*Краіну сваю я люблю, як матулю.*
*Я ёй ганаруся, яе я шаную.*
*Люблю я прыроду: азёры, лугі.*
*Мне кожная кветачка, куст дарагі.*
*А птушкі спяваюць, бы музыка льецца.*
*На ўсю прыгажосць не магу наглядзецца.*
*Такая адна ты на ўсім белым свеце.*
*Хачу я сказаць і дарослым, і дзецям:*
*Што нас вельмі шмат, а краіна адна*
*Ад нас абароны чакае яна.*
*Давайце жыць дружна,бо мы – беларусы.*
*Ніколі не ішоў наш народ на спакусы.*
*Мая Беларусь захапляе красой.*
*І ў сэрцы маім назаўжды  ты са мной.*
*Я - хлопчык маленькі, але ганаруся*
*Што выпала жыць у маёй Беларусі.*

*Анціпаў Арцём Паўлавіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 13 г. Магілёва”*

# *Раздзел “Славутыя імёны Беларусі”*

## *Калі старых кніжак старонкі гартаю*

*Калі старых кніжак старонкі гартаю,*
*Калі чую спеў старадаўніх званоў,*
*Прагну ўсім сэрцам і шчыра жадаю*
*Зірнуць у глыбіні мінулых часоў.*

*Хачу я прайсці Ягайлавым шляхам,*
*Што з Вітаўтам поруч наш край бараніў,*
*Пабачыць старога Полацка дахі*
*І вулкі, якімі Гусоўскі хадзіў.*

*Я мару пра тое, каб ноччу аднойчы*
*Пабачыць Сапегу з Статутам у руках,*
*Ізяслава малога рашучыя вочы,*
*На Грунвальдскім полі ворагаў жах…*

*Продкаў вялікіх павінен быць годным*
*Той, хто сябе беларусам заве.*
*Лічыць бацькоўскі хто край сваім родным,*
*Жадае яму ў стагоддзях квітнець.*

*Будзькова Яніна Якаўлеўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 9 г. Магілёва”*

## Імя Ефрасінні

*Над горадам даўнім званы зазвінелі,*
*Панёсся іх гул на Палотаю сіняй.*
*Іх гукі ў сэрцы трывала заселі*
*Як памяць аб слаўнай святой Ефрасінні.*

*Шчаслівым дзяцінства было ў Прадславы,*
*У любві і дастатку князёўна жыла.*
*Бяды і нястачы дзяўчына не знала,*
*Прыгожай, прывабнаю кветкай цвіла.*

*Была яна часткай славутага роду,*
*Багацце і славу жыццё ёй дало.*
*З дзяцінства любіла дзяўчына свабоду,*
*Каханне і шчасце ў рукі плыло…*

*Аднак жа зямному адмовіла лёсу,*
*Пайшла яна супраць бацькоўскага слова:*
*Без жалю адрэзала доўгія косы*
*І стала навекі нявестай Хрыстовай.*

*Усёю душой палюбіла навуку,*
*Абрала ў жыцці сабе цяжкую сцежку:*
*З вялікім жаданнем, зусім  без прынукі*
*І ноччу, і днём перапісвала кніжкі.*

*Аб ёй гаварылі, як быццам аб цудзе.*
*Зажураным стала яна суцяшэннем,*
*Памочніцай стала пакрыўджаным людзям,*
*Усім распранутым служыла адзеннем.*

*Вялікіх князёў заклікала да ладу,*
*Любоўю сваёй запаўняла прасцяг.*
*Нязведальнай кветкаю райскага саду*
*Імя Ефрасінні гучыць у вяках.*

*Картузава Ксенія Аляксандраўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва”*

## *Памяці Максіма Багдановіча*

*Ён жыў кароткае жыццё*
*І з зоркаю шукаў спаткання,*
*А адышоўшы ў небыццё,*
*Пакінуў скарб, "Вянком" названы.*

*Ён жыў самотнае жыццё,*
*Хваробай цяжкай змарнаваны,*
*Але паэзіі святло,*
*Лячыла боль незагойнай раны.*

*Ён быў вялікім песняром,*
*Ідэй высокіх акрылёны,*
*І вершы пад яго пяром,*
*Ліліся гімнам у свет вольны.*

*Ляцелі птахам белакрылым*
*Да долу роднае зямлі.*
*Будзілі пачуццё надзеі,*
*Палёт душы у свет няслі няслі.*

*Ён быў эстэтам прыгажосці,*
*Паэтам "чыстае красы".*
*Аб шыраце духоўнай дбаіў,*
*Максімам-кніжнікам празваны.*

*Жыў за мяжою, на чужыне,*
*Але не забываў Радзімы.*
*Быў роднай мовай апантаны,*
*У край бацькоўскі закаханы.*

*Маёвай песняй, звонкім рэхам,*
*Яго паэзія гучыць.*
*У вянок красы спляліся вершы,*
*І помнік гэты вечна будзе жыць.*

*Собіна Альбіна Ягораўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі ''Сярэдняя*
*школа № 23 г. Магілёва''*

## *Зорка Скарыны*

*27 жніўня 1979 года*
*савецкі астраном Мікалай Чарных*
*адкрыў у Галоўным поясе астэроідаў*
*Сонечнай сістэмы новы астэроід,*
*які атрымаў назву Скарына ў гонар*
*беларускага першадрукара.*
*БелСЭ*

*Зорка Скарыны – ведаў Сусвет,*
*Што выпраменьвае мовы сакрэт.*
*"Богу ко чти, людям к учению"–*
*Промні навукі як вызваленне.*

*Зорка Скарыны – гісторыі след,*
*Што пакідае ў кнізе сігнет.*
*Люду звычайнаму, мне і табе*
*Пацеркі мудрасці, розуму шле.*

*Зорка Скарыны – вечнасці свет,*
*Што навучае жыць меці як след.*
*Роду вялікаму гэтай Зямлі,*
*Зорка Скарыны, вечна свяці!*

*Бойчанка Валерый Дзянісавіч,*
*вучань V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 31 г. Магілёва"*

## *Памяці Паэта*

*На Магілёўшчыне ёсць рэчка Бесядзь,*
*Аб ёй надоўга застанецца ўспамін,*
*Бо ў яе калысцы нарадзіўся*
*Сваёй зямлі, сваёй Радзімы лепшы сын.*

*З маленства захапляўся ён прыродай,*
*Красой лясоў, палеткаў, Бесяддзю-ракой.*
*І вобраз гэты, сэрцу такі мілы,*
*Ён праз усё жыццё заўсёды нёс з сабой.*

*Пісаць пачаў Аркадзь даволі рана,*
*Паэзіі і музы вязнем хутка стаў.*
*І першае каханне ён старанна*
*У вершы пра Алесю свету расказаў.*

*Ён гаварыў пра свой аблог цалінны,*
*Пра роўнасць, пра любоў, пра вечнае пяро,*
*Пра тое, што ў пачуццях усе адзіны,*
*І што дабро заўжды перамагае зло.*

*Гучаў нам Маналог, працяты болем,*
*Бо ўспамінам быў аб тых, хто ўжо не жыў,*
*Хто на сябе прыняў цяжар няволі*
*І згінуў, як Хрыстос-ахвяра на крыжы.*

*Паэт вайну радком сваім не мінуў:*
*Заложнікі, Мінай, з палона страшны ліст*
*І над магілай брацкай успаміны,*
*Трывога маці, выбухі і кулі свіст.*

*Ён колькі год, нібы лісток дубовы,*
*Быў гнаны ветрам ад радзімай стараны.*
*Але брыгады сцяг і клятвы словы*
*Не выпускаў ні з рук, ні з сэрца ў час вайны.*

*І сёння пра асобу Куляшова,*
*Як і яго сябрук-паэт, магу сказаць:*
*“Як шчырасці тваёй нам не хапае,*
*Як моцна не хапае нам цябе, Аркадзь!”*

*Ларчанка Паліна Сяргееўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва”*

## *У Ляўках*

*Вось настаў чаканы дзень.*
*Сонца, радасць, дрэваў цень.*
*Мы прыехалі ў Ляўкі!*
*Думкі хутка паплылі…*

*Ішлі мы ўсе няшпаркім крокам,*
*Разглядалі ўсё навокал.*
*Бор кругом шуміць-шапоча,*
*Расказаць аб чымсьці хоча.*

*Як любімы наш Купала*
*(Напісаў ён тут нямала!)*
*У гэтай хаце ўлетку жыў,*
*Па сцяжыначках хадзіў.*

*Паглядзіце - Янкі хата.*
*Жыў Купала небагата.*
*Нам пісаць – пра гэта шчасце*
*І сапраўднае багацце.*

*Вось дубоў магутны бор.*
*А вакол – такі прастор*
*Думак розных і натхнення*
*Для радкоў яго стварэння.*

*У музеі шмат здабытку:*
*Рэчы, мэбля, твораў нізка.*
*Шмат Купала тут пісаў,*
*Мудрасць, талент перадаў.*

*Помнік велічны стаіць,*
*Янка ўдумліва глядзіць.*
*Мабыць, хоча нам сказаць:*
*“Трэба мову шанаваць!”*

*Добра тут! Цудоўна тут!*
*Мілы сэрцу гэты кут.*
*У памяці ён застанецца,*
*У кожным сэрцы адгукнецца.*

*Жарын Дзмітрый Ігаравіч,*
*вучань VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 46 г. Магілёва”*

## *Зорка Багдановіча*

*У ціхім небе зоркі размаўляюць*
*І сэнс жыцця імкнуцца разгадаць.*
*Чаму адны запалкаю згараюць?*
*Другім – лёс варыянты можа даць.*

*Тваё жыццё імгненнем праляцела,*
*Пясняр красы, кахання і надзей.*
*І зоркай яркай у неба ўзляцела.*
*Ты будзеш вечна жыць у памяці людзей!*

*Ты кожным словам душу закранаеш,*
*Жаданнем жыць, тварыць, усё паспець!*
*Каханне першае ў сэрцы ты хаваеш,*
*Імкнешся волю лёсу зразумець.*

*Ты васільком у полі расквітнееш!*
*Ты будзеш зоркай уначы свяціць!*
*Усё знікае… Азірнуцца не паспеш!*
*І толькі свет твой усё ярчэй гарыць!*

*Кубракова Віялета Сяргееўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Магілёўская гарадская гімназія № 1”*

# *Раздзел “Настаўніку прысвячаецца”*

## *Любімай настаўніцы*

*Дарагая мая настаўніца,*
*Словы падзякі для Вас*
*З маіх вуснаў ляцяць, не стрымаюцца,*
*За ўсё, што зрабілі для нас!*

*Вы нас пяшчотай сваёй атулілі,*
*Вучылі добрымі быць,*
*Паважаць адзін аднаго гаварылі*
*І сумленна на свеце жыць.*

*Вашы ўрокі, бы казкі, чароўныя*
*Па сцежках ведаў вялі,*
*І заданні складаныя станавіліся лёгкімі –*
*На вяршыню гары ўзыйсці мы змаглі!*

*Дзякуй Вам за тое, што Вы з намі*
*Працавалі, сябравалі і жылі.*
*У кожным сэрцы добры след пакінулі –*
*Вашы ўсе парады мы запомнім назаўжды!*

*Я гляджу на Вас, і вырастаюць крылы,*
*Я настаўніцай таксама быць хачу:*
*Несці дзецям веды, веру ў сілы…*
*Абяцаю: “Я вучыцца буду добра! Усё змагу!”*

*Магдэнка Яўгенія Сяргееўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва”*

## *Настаўніку*

*Душа напоўнена любоўю і павагай,*
*І шчырай удзячнасцю да Вас, наш павадыр.*
*І ў сэрцах, што не абмінулі Вы ўвагай*
*Пачуцці тыя застануцца назаўжды.*

*Вы нам адкрылі цэлы свет навукі дзіўнай,*
*Заўсёды побач з намі ішлі, вучылі жыць,*
*Вялі ўпарта нас да мэты той адзінай,*
*Што перад кожным яркім полымем гарыць.*

*Усю любоў, разважлівасць, павагу, веды*
*З цярпеннем укладалі ў нас, сваіх дзяцей,*
*Каб кожны тое, чаго ён яшчэ не ведаў,*
*Мог зразумець хутчэй, дакладней і прасцей.*

*І перад намі раскрывалі таямніцы*
*Героі твораў, словы ў буквары, склады,*
*Матэматычныя рашэнні і табліцы,*
*Цывілізацыі, краіны, гарады.*

*Прызнацца шчыра, не заўсёды паслухмяным,*
*Адказным і працалюбівым быў наш клас.*
*А Вы кідалі ўслед свой позірк палымяны*
*І нібы запрашалі лепшымі стаць нас.*

*І гэты позірк ясных, непаўторных, мілых,*
*Знаёмых нам усім настаўніцкіх вачэй*
*Святлом пяшчотным зіхаціць над намі шчыра*
*І робіць усё навокал прыгажэй, ярчэй.*

*Мы ўдзячны Вам за ўсё, што атрымалі ў школе,*
*За веды, за любоў, што нам далі спаўна.*
*Мы – Вашы вучні, што збіраюцца на волю*
*І вылятаюць, нібы птушкі, з-пад крыла.*

*Чакае кожнага свой лёс, свой шлях адзіны,*
*Але перад вачыма нашымі стаіць*
*Ваш светлы вобраз і вачэй той позірк дзіўны,*
*Якія ў жыцці не здолеем забыць.*

*Масейкіна Анастасія Русланаўна,*
*вучаніца XI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва"*

## *Настаўнік вучыць нас дабру*

*Настаўнік вучыць нас дабру,*
*Людзей старэйшых паважаць,*
*Любіць і брата, і сястру,*
*Бацькоў заўсёды шанаваць.*

*Штодня настаўнік вучыць нас*
*Краіну родную любіць,*
*Каб з плёнам бавілі мы час,*
*Каб усё ў жыцці маглі рабіць.*

*Настаўнік вучыць нас чытаць*
*Лічыць, пісаць і іншым ведам.*
*Ён вучыць нас не забываць*
*Пра мужны подзвіг нашых дзедаў.*

*Настаўнік вучыць сябраваць,*
*Сумленне мець і быць адважным,*
*Слабым заўжды дапамагаць,*
*Бо ў жыцці ўсё гэта важна!*

*Жуйкоў Барыс Паўлавіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 43 г. Магілёва"*

## *Настаўнікам*

*Чаму настаўнікаў спрадвеку паважаюць?*
*Яны навуку і дабро ў свет нясуць,*
*Пра ўсе свае праблемы часта забываюць*
*І дзеткам сваё сэрца аддаюць.*

*Ім часам трэба многа пастарацца,*
*Каб у маленькім вучні талент свой адкрыць.*
*Яшчэ – праверыць сшыткі, да ўрокаў рыхтавацца,*
*І дапазна ў акенцах іх святло гарыць.*

*І можам мы ўсе ў тым пераканацца,*
*Што не было б без іх ні інжынера, ні паэта.*
*І пра настаўнікаў павінны мы прызнацца:*
*Трымаецца на іх уся планета.*

*Каб не настаўнікі, мы б так і не пазналі*
*Пра множанне і пра зямной асі наклон,*
*Як нашы прадзеды жылі і ваявалі.*
*Настаўнікі! Вам найніжэйшы, да зямлі, паклон!*

*Сапроненка Вікторыя Андрэеўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 33 г. Магілёва”*

## *Слова аб першым настаўніку*

*Прысвячаю*
*маёй першай настаўніцы*
*Кузьміной Жанне Аляксандраўне*

*Чалавек пакідае рознае:*
*Вершы, рэчы, сваіх дзяцей,*
*Кнігі, запісы, песні слёзныя,*
*А Настаўнік – проста Людзей.*

*І ацэняць яго, я думаю,*
*Па тых вучнях, што ў свет ён пусціў,*
*Па іх талентах, па іх здольнасцях,*
*Што Настаўнік знайшоў і развіў.*

*І падзякаю будзе лепшаю*
*За бяссонніцу, неспакой,*
*Калі дзеці ў турботах, клопатах*
*Успамінаць яго будуць парой.*

*Ад Вас мы не чулі папрокаў,*
*Крыку, злосці і чорнай маны.*
*І ў жыцці сваім першыя крокі*
*Разам з Вамі рабілі і мы.*

*Разам з Вамі мы спрабавалі*
*Першы поскрып пяра на лісце,*
*Разам з Вамі адказу чакалі,*
*Захапляліся: вішня цвіце.*

*Разам з Вамі…усё было разам:*

*Перамогі, змаганні і зноў!*
*Вы для нас, як старэйшы сябар,*
*Ды і мы для Вас – за сяброў.*

*Мне пашчасціла ў гэтым плане,*
*Мне пашчасціла – не схлушу,*
*Што сустрэла я Чалавека,*
*Зразумеўшага маю душу.*

*Я схіляюся нізка-нізка*
*І ўдзячная без канца*
*Вам, Настаўніку ад калыскі,*
*Вам, Настаўніку ад жыцця.*

*Старыкава Марыя Паўлаўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 37 г. Магілёва”*

## *Першай настаўніцы*

*Я нарадзіўся і жыву ў Магілёве.*
*Імя паэта носіць вуліца мая.*
*Аб гэтым я даведаўся у школе –*
*Там, дзе чацвёрты год вучуся я.*

*У школу раніцай іду з вялізным ранцам,*
*Каб веды аб сусвеце набываць.*
*З сябрамі там прыемна сустракацца,*
*Настаўніцу з усмешкай прывітаць.*

*Для вучня кожнага ў сэрцы знойдзе месца,*
*Яна, нібыта ў клас святло нясе.*
*Імя маёй настаўніцы – Інэса,*
*І ёй мы захапляемся ўсе.*

*Сваю настаўніцу мы вельмі паважаем –*
*Яна за кожнага хварэе ўсей душой.*
*І з паўгады я з сумам разважаю,*
*Што хутка развітаемся мы з ёй.*

*Мне будез вельмі цяжка раставацца,*
*А час ідзе – яго нам не спыніць.*
*І нашу першую і лепшую з настаўніц*
*Ніколі немагчыма пазабыць.*

*Пляшчэеў Арцём Сяргеевіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “НПК яслі-сад – сярэдняя школа № 44 г. Магілёва”*

## *Настаўніку*

*З першага класа, з пачатку вучобы*
*Кожны дзянёчак ты побач заўжды.*
*Вельмі прыйшлася табе да спадобы*
*Нялёгкая праца – дзетак вучыць.*

*Кожную раніцу ўзімку і ўвосень*
*Шпарка бяжыш ты, спяшаешся ў клас.*
*Вось на гадзінніку роўна ўжо восем,*
*Прыязна і шчыра глядзіш ты на нас.*

*Роднае мове ты нас навучаеш,*
*Правілы, правілы кожны ўрок,*
*Толькі на ёй з намі ты размаўляеш,*
*Тым прывучаеш любіць свой куток.*

*А Багдановіч, Купала ды Колас...*
*З імі знаёміла нас упершыню.*
*Бы ручаёк, ціха ліўся твой голас,*
*З гэтага часу я вершы люблю.*

*Ты ўсміхалася над сачыненнем:*
*Што за памылкі, проста бяда!*
*І навучала з новым натхненнем,*
*Час прабягаў, як у рэчцы вада.*

*Дзякуй табе, мой настаўнік любімы,*
*За шчырае сэрца, за ночы без сну.*
*За тое, што любіш ты маці-радзіму,*
*Я гэту любоў праз жыццё пранясу.*

*Мы хутка ўжо скажам – да пабачэння,*
*Іншыя дзеці прыйдуць у клас…*
*Жадаем новых і добрых здзяйсненняў,*
*Мы ўдзячны табе, твой помнім наказ!*

*Бондар Маргарыта Ігараўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 28 г. Магілёва”*

## *Настаўнікі-чараўнікі*

*Не за гарамі і лясамі*
*Жывуць чараўнікі – яны між нас.*
*У школе вучняў сустракаюць,*
*Вітаюць шчыра, вядуць у клас.*

*Мы з імі разам адкрываем*
*Сяброўства свет і далячынь планет.*
*Малюем, пішам і чытаем,*
*Навукі пазнаем сакрэт.*

*Ці на двары зіма лютуе,*
*Ці восень шапаціць ліствой.*
*Настаўнікі прыносяць веды,*
*Што будуць і далей са мной!*

*Наўрузаў Назар Цімуравіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 19 г. Магілёва”*

## *Мой настаўнік*

*Мой настаўнік самы лепшы!*
*Ведае на свеце ўсё:*
*Пра жыццё, пра дыназаўраў і канешне пра кіно.*

*Можа пець, як Пугачова.*
*Маляваць, як той мастак.*
*Фізкультураю займацца*
*І садзіцца на шпагат.*

*А таксама ноч не спаць*
*І дыктанты правяраць.*
*Прасядзець увесь абед,*
*Разбіраць увесь наш брэд,*
*Што збіралі мы ўсім класам,*
*У сачыненні нашым.*

*У вечары ўсім атвеціць*
*У чаце нашым, у інтэрнэце.*
*Ведае ўсё пра Полю, Мілу, Ігара, Арцёма.*
*Хто балее, хто ўцёк, хто спазніўся на ўрок.*

*Можа сышчыкам работаць,*
*Зменку Міліну шукаць.*
*Можа ў снезе, нават ноччу,*
*Тэлефон знайсці, які*
*Згубіў у абедзе Ігар*
*Падарунак дарагі.*

*Колькі б не было хлапот*

*У Тацяны нашай,*
*Ведаем, яна “гарой” за ўсіх вучняў нашых,*
*Хай кожны ведае хто яна –*
*Наша Тацяна Паўлаўна!*

*Новікава Мілана Аляксееўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 38 г. Магілёва”*

## *Настаўніца першая мая*

*Значных прафесій у свеце нямала,*
*Але толькі адна з іх мне ў сэрца запала.*
*Запала тады, калі ў школу пайшоў,*
*Калі на лінейцы клас свой знайшоў.*

*Прыйшоў і стаю, не магу зразумець,*
*Як буду вучыцца, як буду сталець.*
*А побач з бацькамі стаяла яна –*
*Настаўніца першая мая.*

*Яна ўсміхнулася, вочы блішчэлі.*
*Як быццам: "Не бойся!"- яны вымаўлялі.*
*І зразумеў: гэта мой чалавек –*
*Гатоў з ёй застацца амаль што навек.*

*І, стаўшы на мачту таго карабля,*
*Узяўшы штурвал у свае рукі,*
*Яна добрым словам нас павяла*
*Па хвалях школьнай навукі.*

*Яна навучыла нас сябраваць,*
*Лічыць, маляваць, чытаць і пісаць,*
*Радзіму любіць і бацькоў шанаваць,*
*У школе ніколі не сумаваць.*

*Яна грэла нас цеплынёй сваёй душы*
*І сэрцам любіла бясконца.*
*За ўсе нашы поспехі ў спорце, у жыцці*
*Яна ганарылася моцна.*

*Значных прафесій у свеце нямала,*
*Але толькі адна з іх мне ў сэрца запала…*

*Казуцін Мацвей Ігаравіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Гімназія № 4 г. Магілёва”*

## *Першы настаўнік*

*Настаўнік! Якое цудоўнае слова*
*Абрала для вас беларуская мова!*
*І нават паэты, калі ўзгадаюць,*
*Настаўнікам вершы і песні складаюць.*

*Паэткай сябе я назваць не бяруся,*
*Бо рыфмы я ў іншых пакуль пазычаю.*
*Радкі, што стварыць толькі-толькі вучуся,*
*Людміле Аркадзьеўне я прысвячаю!*

*Бо першы настаўнік – ён самы галоўны!*
*Ён мае на дзетак уплыў безумоўны.*
*Не садзіць ён іх да сябе на каленкі,*
*Але ж ён як маці для вучняў маленькіх.*

*Людміла Аркадзьеўна нас навучыла*
*Чытаць і пісаць і, вядома, сачыла,*
*Людзьмі каб раслі і сяброўства цанілі,*
*Свой край берaглі і яго баранілі.*

*За матчыну ласку, за гукі і лікі,*
*За веды мае і любоў да прыроды*
*Людміле Аркадзьеўне дзякуй вялікі!*
*Бо першы настаўнік у сэрцы заўсёды!*

*Палазкова Лізавета Мікалаеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва"*

# Раздзел “Ёсць такая прафессія – Радзіму абараняць”

## Мужчынам быць зусім не проста

*Хлапчук… Юнак… І вось – мужчына!*
*А ім не кожны зможа быць,*
*І ўзрост не будзе ў тым прычынай.*
*Чаму ж? Імкніся не забыць:*

*Мужчынам стаць зусім не проста,*
*Ім нарадзіцца – мала ледзь.*
*І рост пад метр дзевяноста*
*Не кожнаму патрэбна мець.*

*Ты не лічы сабе мужчынам,*
*Пакуль прысягу не даваў*
*Ды аўтамат з процівагазам*
*На марш-кідку не апранаў.*

*Салдаты плакаць не ўмеюць,*
*Трымаюць сум свой у сабе.*
*Іх слёзы толькі выступаюць*
*Халодным потам на спіне.*

*Вайна не раз мужчын знішчала,*
*Сціскала так, што нельга быць.*
*Надзея ціха ўзрастала,*
*І зноў хацелася ўсім жыць.*

*Прайшла эпоха за эпохай.*

*І ў звівах гістарычны ход*
*Мужчын сапраўдных не палохаў…*
*Ім змена – сённяшні народ.*

*Стаяць, як віцязі, унукі,*
*І годнасць ззяе ў вачах.*
*Трымаюць зброю моцна рукі,*
*Іх не клапоціць слова "страх".*

*Забудзьце, чужакі! Ніколі*
*Вам Беларусь не зваяваць.*
*Мужчыны гартавалі волю,*
*Радзіму змогуць адстаяць!*

*Вішнякоў Аляксандр Дзмітрыевіч,*
*вучань VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 11 г. Магілёва*

## *Ты перамог сляпую смерць*

*Ты перамог сляпую смерць*
*І вучыш нас спяваць і верыць,*
*Каб лёгкім крокам лёс свой мерыць,*
*Ты перамог сляпую смерць.*
*Жыццё не спыніш аніяк,*
*І сонца куляй не застрэліць.*
*Ты перамог сляпую смерць*
*І вучыш нас любіць і верыць.*

*Казакоў Даніл Віктаравіч,*
*вучань X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 18 г. Магілёва”*

## *Быць абаронцам*

*На ўроку настаўнік спытаў:*
*«Якую прафесію вам выбіраць?»*
*І вучань адзін адказаў:*
*«Радзіму сваю буду абараняць!*

*Пайду на парадзе ў страю,*
*Медалі хай ззяюць на сонцы.*
*На плошчы з сябрамі стаю –*
*Адважныя мы абаронцы.»*

*Сціх настаўнік на пару хвілін,*
*На вучня ўважліва глядзя.*
*«Вядома ж, дзянёчак адзін*
*Ты будзеш стаяць на парадзе.*

*Дзе б ты не выбраў служыць:*
*У нябёсах, вадзе ці ў поле –*
*Трэба смелым, вынослівым быць,*
*Не баяцца нічога ніколі.»*

*Хлопчык выслухаў  і адвярнуўся.*
*Ціха, моўчкі  глядзя ў ваконца.*
*Але ж раптам усім усміхнуўся:*
*«Вырашыў цверда быць абаронцам!»*

*Нікіценка Алег Аляксандравіч,*
*вучань ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “НПК яслі-сад – сярэдняя школа № 44 г. Магілёва”*

## *Падзяка вызваленцам*

*Я вельмі люблю сваю Белую Русь,*
*Дзе я нарадзілася, дзе я вучуся,*
*Дзе ў школу хаджу, дзе жыву і пяю,*
*Смяюся я сонейку, кожнаму дню!*

*І я разумею: за гэта мне трэба*
*Падзякаваць прадзедам, дзедам сваім,*
*Яны нам пакінулі чыстае неба.*
*Як добра жывецца пад небам такім!*

*Дзякуем Вам, вызваленцы Радзімы!*
*Жыццём і крывёю вы мір зберaглі.*
*Галовы мы схілім пад звоны Хатыні,*
*Жыць і вучыцца ўсе мы змаглі.*

*Помнім пра Вас, і ў горадзе нашым*
*Вуліцы носяць імёны вашы.*
*Мы ганарымся, любім, шануем.*
*І з Перамогай заўсёды віншуем!*

*Шведаў Іван Ігаравіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва"*

## *Абаронцу*

*Любімая Радзіма -*
*Мой лепшы ў свеце край,*
*Дзе родным усё здаецца:*
*Рачулка, поле, гай.*
*Дзе ўсе пад небам мірным*
*Шчасліва мы жывём.*
*Бо ты абараняеш*
*Краіну, як свой дом.*
*Салдат!Ты ў час нядолі*
*Закрыеш усіх сабой,*
*Не дрогнеш ты ніколі,*
*Ты выйграеш свой бой.*
*Каб з неба сонца ззяла,*
*Каб чуўся смех дзятвы,*
*Радзіма каб стаяла -*
*Ёсць ваяры, ёсць вы!*
*З удзячнасцю, з любоўю*
*Мы вам глядзім услед.*
*Вы – абаронцы нашы*
*Ад страху, слёз і бед.*

*Ракоўскі Аляксандр Васільевіч,*
*вучань VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 46 г. Магілёва”*

## *Сыны беларускіх нябёс*

*Памяці лётчыкаў Андрэя Нічыпарчыка і Мікіты Куканенкі*

*Вясна… Баранавічы… Птушкі!*
*Які цудоўны ў іх палёт!*
*І раптам… ВЫБУХ! Дым удушны.*
*Вайна? Разбіўся самалёт!*

*Як чорны госць, бяда прыходзіць*
*І ўсё змяняе на свой лад,*
*Пякучым болем карагодзіць.*
*Герояў не вярнуць назад.*

*Што ў памяці за крок у вечнасць?*
*Каханых вочы, смех дзяцей?*
*Мо, дом бацькоў? Іх чалавечнасць?*
*Ці лёсы многіх, хай чужых людзей?*

*Яны цаною сваіх жыццяў*
*Ратуючы людзей з бяды,*
*Сціскаючы штурвал у забыцці,*
*Той горад толькі помнілі тады.*

*Як маці расказаць пра страту?*
*Які пусты без іх прастор!*
*І растлумачыць як, што тата*
*Не з намі? Ён бліжэй да зор...*

*Схіляемся ў жалобнай скрусе,*
*Так цяжка нам сказаць: "Бывай!"*

*Сынам-героям нашай Беларусі.*
*Як ганарыцца імі родны край!*

*Лунаюць птушкі ў паднябессі,*
*Над горадам ізноў той май.*
*Хай зорны дождж пяе ім песні.*
*Жыві! І подзвіг іх не забывай!*


*Фурсава Марыя Вячаславаўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва”*

# *Раздзел “Беларуская мова”*

## *Мая мова*

*Родная мова, мілая мова!*
*Песняй да сэрца кранае размова!*
*Родную мову маёй Беларусі*
*Чую з дзяцінства і ёй ганаруся!*

*Помню прыгожыя матчыны спевы!*
*З імі мы будзем навечна, напэўна!*
*Як залацісты ад сонца праменьчык,*
*Гук ты пачуеш – зардзее агеньчык!*

*Усю прыгажосць маёй любай краіны –*
*Рэкі, азёры, клёкат буслоў.*
*Усё зберагчы мы з табою павінны –*
*Скарбы жывых родных слоў!*

*Кожны з маленства запомніць павінен*
*Гэты асноўны закон у жыцці:*
*Толькі шануючы родную мову,*
*Зможам мы шчасце знайсці!*

*Дзегцяроў Станіслаў Ігаравіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 35 г. Магілёва*

## Родная мова

*Нельга роднага слова цурацца,*
*Мову родную нельга забыць,*
*І каб мог беларусам ты звацца –*
*Беларусь сваю трэба любіць!*

*Нашы казкі і песні з народа,*
*Нам з калыскі вядомы яны.*
*У іх людзі, і быт, і прырода,*
*І адбіткі мінулай вайны.*

*І каханне, і светлыя мары,*
*Краявіды радзімай зямлі.*
*Неабсяжныя пушчы-абшары…*
*Усё, што продкі для нас зберaглі.*

*Мы павінны быць чулыя сэрцам,*
*Мець душу без злабы і спакус.*
*Быць як промень, як свет у акенцы*
*Бо такім быў заўжды беларус!*

*Касцянкова Марыя Андрэеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 13 г. Магілёва"*

## *Мая мова*

*Мілагучная, дзіўная, родная мова!*
*Ты – калыска ўсіх пакаленняў.*
*Я люблю цябе, шчырае, кроўнае слова,*
*Нашых мар і думак натхненне.*

*Маці, тата, Айчына, зямля,*
*Журавіны, суніцы, чарніцы,*
*Добра ўспаханая зямля*
*І салодкі пах медуніцы.*

*Як ліецца сугучча слоў,*
*Як ліецца сугучча гукаў!*
*Колькі спеўных, гучных радкоў!*
*Колькі ў іх таямнічых рухаў!*

*Наша мова прайшла скрозь вякі*
*Праз няшчасце, вайну, знішчэнне.*
*Усё вытрымаць продкі змаглі,*
*Каб пакінуць яе пакаленням.*

*Ты жыві, мая мова, квітней,*
*Лашчы нас меладычнымі спевамі.*
*Будзем мы з табой багацей*
*І ў сэрцы з тваімі напевамі!*

*Долбун Арцём Паўлавіч,*
*вучань VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва”*

## *Родная птушка-песня*

*З веку ў век лятала над краінай песня,*
*Мілагучней за яе не было нідзе ў свеце,*
*Разляталася паўсюль у паднябессі,*
*Жыла ў сем'ях, маці спявалі яе дзецям.*

*Пелі песню музыкі свабодна,*
*У творах усхвалялі паэты,*
*Бо вядома: згінуць народы,*
*Калі страцяць песню гэту.*

*Прайшлі часы, прыляцелі новыя,*
*Больш крыклівыя, песні нахабныя.*
*Цішэй стала гучаць песня родная,*
*Замянілі яе песні прывабныя.*

*Што з табою сталася, мілая?*
*Дзе цяпер твае гучныя словы?*
*Ці загналі цябе ў клетку сілаю?*
*Або наклі на цябе аковы?*

*Распрастай свае крылы і ў неба,*
*Падымайся хутчэй, бо так трэба.*
*Хопіць спаць, ёсць важнейшая мэта,*
*Чуеш: стогнуць і плачуць паэты!*

*Уставай з руін па літарах,*
*Узмацняйся хутчэй ты словамі,*
*Уздымайся ўгару, калі ласка,*
*Беларуская наша мова!*

*Касякова Ксенія Аляксееўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва"*

## *Роднай мовы клубочак*

*Я сцішэю ўвечары, сяду,*
*Роднай мовы клубочак вазьму*
*І звяжу з гэтых слоў утрапёных*
*Цёплы шалік, каб грэў у слату.*

*Я спляту з дзіўнай мовы вяночак*
*І валошкай аздоблю радок,*
*Каб Максіма нашчадкі заўсёды*
*Адчувалі ўзнёсласці крок.*

*Гэтай ніткай слоў самавітых*
*Вышываць буду мудры ручнік,*
*Што з’яднае ўсіх нас у скрусе,*
*Стане шляхам да сонечных ніў.*

*Я складу з ніткі-вязкі санеты*
*Пра надзённы мой хлеб на стале,*
*Што натоліць моцай жыццёвай,*
*Лустай мовы ў бядзе зберажэ.*

*Я спяю табе, мілая, песню,*
*Пра матулінай ласкі прамень,*
*Што люляе ў мяккіх далонях,*
*Дорыць веру ў заўтрашні дзень.*

*Я сцішэю ўвечары, сяду*
*І на рукі мову вазьму,*
*Да грудзей маленькіх прыцісну,*
*Шчырым сэрцам навек абдыму.*

*Таранава Вераніка Анатольеўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 31 г. Магілёва”*

## *Мая мова*

*Слова беларускае,*
*Як калыханка гушкае.*
*Слова беларускае*
*Яскравае і слушнае.*

*Слова беларускае*
*Пяшчотнае і роднае.*
*Слова беларускае*
*Самае лагоднае.*

*Слова беларускае –*
*Матчына слова.*
*Слова беларускае –*
*Гэта мая мова!*

*Таранава Марыя Сяргееўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 25 г. Магілёва"*

## *Родная мова*

*Мову родную сваю*
*Мілагучнаю лічу.*
*А інакш ніяк не скажаш,*
*Я вам гэта дакажу.*
*Ну ў якой, скажыце, мове*
*Знойдзеце  такія словы:*
*“… З кожнай лісцевай галоўкі*
*Глядзіць твар восені- свякроўкі.*
*Павее ветрык, шурхнуць травы,*
*Няма ў ім ласкі, ні забавы…”*
*Міла, гучна, сакавіта,*
*Ярка, зычна, дзелавіта.*
*Так гучаць любыя словы,*
*Нібы льюцца па прасторы.*
*Мову родную сваю*
*Мілагучнаю лічу.*
*А на ёй хто размаўляе,*
*Беларусамі заву.*

*Барыгіна Ясенія Русланаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва”*

## *Маёй мове*

*Я табе пажадаю шчасця,*
*Твайму сэрцу – народнай любові!*
*А яшчэ – каб жыла без нянасця,*
*Больш свяцілася ў кожным слове!*
*Емкім гукам каб клікала шчыра*
*Працаваць і Радзіму ўслáвіць,*
*Апяваць родны край ганарліва,*
*Жыць, і помніць, і верыць, і марыць!*
*А яшчэ для цябе – ціхай ласкі,*
*Дабрынёй і спагадай сагрэцца.*
*Агнявістыя песні і казкі*
*Юнакі  хай прытуляць да сэрца!*
*Шэптам памяці продкаў любімых,*
*Чыстай кропляй з гаючай крыніцы*
*Асвятляеш дзяцей сваіх мілых,*
*Скарбы сонца – твае таямніцы!*
*Цёплых думак, натхнення, багацця –*
*Я табе пажадаю шчасця!*

*Сафонава Сняжана Сяргееўна,*
*вучаніца Х класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва"*

## *Словы роднай мовы*

*Прыгожая родная мова,*
*Мілагучнае кожнае слова.*
*Мова – продкаў спадчына,*
*Ласкавая, нібы песні матчыны.*
*Гучаць дзівосна словы,*
*Яны жыцця асновы:*
*Каханне, пяшчота, ласка,*
*Прывітанне і калі ласка,*
*Сумленне, шчырасць і свята,*
*Дабрабыт, матуля і тата,*
*Замілаванне і асалода –*
*Гучаць усе словы лагодна.*
*Шануйце мову, любіце,*
*На ёй размову вядзіце!*

*Разакова Мілана Русланаўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*"Гімназія №4 г. Магілёва"*

## *Мая мова*

*Я ўсхваляю мову нашу,*
*Што крынічкаю журчыць,*
*Што, як ветрык, у чыстым полі*
*Так ласкава шапаціць.*
*На ёй маці калыханку*
*Мне спявала шмат разоў,*
*Буду памятаць заўсёды*
*Мілагучнасць гэтых слоў.*
*Не забуду я ніколі*
*Словы родныя свае,*
*Словы мовы беларускай:*
*Няма лепшай за яе!*

*Селядцоў Станіслаў Канстанцінавіч,*
*вучань VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 17 г. Магілёва”*

## *Калі ласка, кажыце на мове*

*Калі ласка, кажыце на мове*
*Беласнежнай, зімовай, чыстай!*
*Так-так-так! Нашай роднай, мілай-*
*Беларускай мове ўрачыстай!*

*Калі можна – паедзем ў дзяцінства,*
*Дзе прастора снягамі засцелена,*
*Дзе Марозам магутным павелена*
*Жыць з прыродай сваей у адзінстве.*

*Калі можна, вярніце той пах:*
*Блін, варэнне, куцця на Каляды!*
*Снегавік на высокіх камах,*
*Што сябры пакаталі на градах!*

*Калі можна – вярніце мне дворык:*
*Там у снежкі гулялі дзятвою,*
*Каля лаўкі маленечкі столік,*
*Дзе вяліся размовы гурбою!*

*Калі ласка – вярніце мне фанцікі,*
*Тых цукерак, чым елка ўпрыгожана,*
*Мы для кошкі круцілі з іх банцікі*
*І за нітку чаплялі ў прыхожай.*

*Калі можна, вярніце мне печку,*
*Дзе ўвечары слухалі казкі,*
*Дзе матуліна мова, бы свечка,*
*Прасвятляла нас мудрасцю, ласкай.*

*Калі ласка, вярніце мне дрэва –*
*Што карэнне пусціла за хутарам!*
*Не адно! Мне патрэбны ўсе спевы*
*Беларускага лесу магутнага!*

*Высоцкая Сафія Дзмітрыеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 35 г. Магілёва”*

## *Мы ўсе забыліся, на жаль…*

*Аднойчы, ідучы са школы,*
*Я ўспаміналa наш урок…*
*Звінелі словы роднай мовы!*
*Іх ведаць – гэта мой зарок!*

*І вось заходжу я дамоў,*
*Ціхенька дзверы адчыняю,*
*З пакоя бацька выйшаў мой,*
*На роднай мове я яго вітаю.*

*,,Мой любы тата, прывітанне! –*
*Ляцелі словы ад душы. –*
*Чакалі вы маё вяртанне?*
*Як справы ў вас, мае бацькі?”*

*Тут маці падышла да нас,*
*Глядзіць і ціха ўздыхае,*
*А потым кажа: ,,У першы раз*
*Дачка так сэрца закранае…*

*Мы ўсе забыліся, на жаль,*
*Што словы ёсць у нас, ёсць мова.*
*Вось гэта значная дэталь*
*Павінна стаць жыцця асновай!*

*А мы спяшаемся, бяжым,*
*Не чуем усю пяшчоту слова.*
*Ці ўспомнім верш мы хоць адзін?*
*Чаму вучылі нас у школе?!”*

*І вось цяпер па вечарах,*
*Калі збіраемся мы разам,*
*Чытаем вершы. Потым – узмах!*
*Хто больш з нас пракаказак раскажа?*

*Я заклікаю вас, сябры,*
*Узор з маёй сям'і бярыце!*
*Тады ўсе разам будзем мы!*
*Радзімы гонар узднміце!*

*Макеева Анастасія Уладзіміраўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 22 г. Магілёва"*

## *Ганарыся мовай беларускай!*

*Мая спадчына – чароўны кут,*
*Дзе віюцца рэкі сіняй стужкай…*
*І калі ты нарадзіўся тут,*
*Думай кожны раз па-беларуску.*

*Дадзены табе свабоды рай:*
*Размаўляй па-польску, па-французску…*
*Але ж калі любіш ты свой край,*
*Гавары на мове беларускай!*

*Добра тут і дыхаць, і любіць,*
*І спаймаць аднойчы шчасця птушку…*
*Калі хочаш ты сумленным быць,*
*Не цурайся мовы беларускай!*

*Песні нашы – не пераспяваць!*
*Святы пачынаюцца з калыскі.*
*Хочаш сваіх продкаў шанаваць?*
*Захапляйся мовай беларускай!*

*Зямлі роднай крыўдна ўспрымаць*
*Гутаркі дзяцей сваіх па-руску.*
*Як не хочаш ты бязродным стаць,*
*Ганарыся мовай беларускай!*

*Самкова Дар'я Аляксееўна,*
*вучаніца XI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 13 г. Магілёва"*

## *Матуліна песня*

*Пяшчотныя гукі матулінай песні*
*Ціха лунаюць у паднябессі,*
*Шэранем ранка ляжаць на галінцы,*
*Звонка трымцяць у лясной ручаінцы…*

*Гукі пяшчотныя, мілыя, родныя*
*Мовы маёй беларускай народнай*
*Сонечным промнем з-за хмар прабіваюцца,*
*Белай сняжынкай зямелькі касаюцца,*

*Сіняй пралескай глядзяць у нябёсы,*
*Шчасце ўплятаюць у дзявочыя косы…*
*Мова плыве над Дняпром туманамі,*
*У Пушчы тапоча капытам з зубрамі.*

*А над Палессем бусліным крылом*
*Ціха, пяшчотна ўплывае ў мой дом…*
*Матчына слова і матчына песня*
*Зноўку лунаюць у паднябессі…*

*Марчанка Яўгенія Мікалаеўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва"*

## *Родная мова*

*Калі дзіцяці нараджаецца,*
*Расце яно і развіваецца.*
*Канешне, сілы набіраецца*
*І мовай роднай напаўняецца.*

*Якая пявучая родная мова,*
*Прыгожа гучыць яе кожнае слова.*
*Куды б ні паехаў, куды б ні паплыў*
*Так важна, каб народ сваю мову любіў.*

*Любіў, паважаў, карыстаўся ён мовай*
*Хачу, каб плылі ўсюды родныя словы.*
*Як песня, якая пяшчотна гучыць,*
*Без роднае мовы не можам мы жыць.*

*Бо кожнаму дарыць яна столькі скарбаў,*
*Малюе прыроду без пэндзліка, фарбаў.*
*І ў песнях гучыць меладычна, ласкава*
*Без роднае мовы зусім не цікава.*

*З маленства спяваем яе ў калыханках,*
*А потым чытаем мы казкі на ганках.*
*І пішам ў сшытках, паштоўках, інэце*
*Аб розных пачуццях, падзеях у свеце.*

*Ніколі ад мовы не адракайся!*
*Вучы, праслаўляй яе, ёй карыстайся!*
*Каб ведалі ўсе: дарослыя, дзеці,*
*Што мова, як маці, адзіная ў свеце!*

*Сцельмашок Юлія Алегаўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва”*

## Раздзел "Вершы на вольную тэму"

### Я так адчуваю мір

*Адрэжу кавалак ад сонца.*
*Здаецца - сапраўдны сыр.*
*А вочы мае - ваконцы.*
*Я так адчуваю мір!*

*З нябёсаў дастану зорку.*
*Уяўляю, што я мастак.*
*Малюю зоркаю горку.*
*Я мір адчуваю так!*

*Мне кажуць: "Малюеш нязграбна.*
*Звычайны, ніякі не сыр!"*
*А мне ўсё на свеце прывабна.*
*Я так адчуваю мір!*

*Малюю на хмарах кветкі.*
*Пунсовыя, быццам мак.*
*На дрэвах - ружовыя веткі.*
*Я мір адчуваю так!*

*На моры малюю таксама*
*Працёртыя хвалі да дзір.*
*Танцуе з дэльфінамі мама!*
*Я так адчуваю мір!*

*Малюю цудоўнага птаха.*
*Зноў чую: "Усё роўна прастак".*

*"Спыніцесь! Увага! Увага!*
*Я мір адчуваю так!"*

*Не слухай нікога ніколі*
*Іх думкам каштоўнасць пяць лір*
*Адказвай з усмешкай паволі:*
*"Я так адчуваю мір!"*

*Сацура Глеб Русланавіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва"*

## *Лес вясной*

*Ажывае лес вясной.*
*Вось мурашнік пад сасной*
*Аж гамоніць і кіпіць.*
*Птушкам трэба гнёзды віць.*

*Дрозд у хвойніку спявае,*
*Дзяцел грукае ў бары.*
*Барсучка сагрэла сонца,*
*Ён спяшаецца з нары.*

*А бялюткія пралескі*
*Усміхаюцца вакол.*
*Быццам сонечныя зоркі,*
*Дываном услалі дол.*

*У гушчары схаваўся вецер,*
*Не пужае ён звяроў.*
*Мы таксама не пакрыўдзім*
*Лясных добрых жыхароў!*

*Ленкавец Яраслава Мікалаеўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 5 г. Магілёва”*

## *Дзедава памяць*

*Вазьму я ў рукі стары свой айфон,*
*Мне зняць на відэа патрэбна дзеда,*
*Хоць размаўляць не можа добра ён*
*(пасля кавіда два інсульта зведаў!)*

*Але той ролік потым зберагу,*
*І дзяцям пакажу яго, і ўнукам.*
*Пра час былы даведацца змагу*
*Не менш, чым з гістарычнае навукі.*

*Не быў мой дзед салдатам на вайне,*
*Бо нарадзіўся толькі ў сорак трэцім.*
*Але шмат можа распавесці мне,*
*Пра час пасля навалы-ліхалецця.*

*Былі пасляваенныя гады*
*Гаротнымі  і цяжкімі не меней.*
*Хоць не гучалі выбухі тады,*
*Ды не хапала для зямелькі зерня.*

*Ратоў сямёра, дзед мой самы меншы,*
*Адна матуля дзетак гадавала.*
*З Берліна бацька не дайшоў да іх –*
*У вёсцы шмат бацькоў вайна забрала!*

*Адсутнічаў і дах над галовой,*
*Бо хата спалена ў час акупацыйны.*
*Жылі  ўсе ў лазні гэтакай сям'ёй  –*
*Без лекаў, дактароў і медыцыны.*

*Ісці да школы – кіламетраў пяць,*
*Праз поле, лес, вялізныя сумёты,*
*А летам – у калгасе працаваць,*
*І статак пасвіць- не злічыць турботаў.*

*Тым людзям, што жылі ў нялёгкі час,*
*Мы ўсё яшчэ падзякі не сказалі.*
*Адбудавалі вы жыццё для нас,*
*Радзіму з пеплу нам адбудавалі!*

*Маркава Ганна Уладзіміраўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 35 г. Магілёва"*

# *Люты*

*Зіма. Мароз і снег скрыпіць,*
*А сонца ярка слепіць вочы.*
*І неба чырванню гарыць -*
*Дзень карацейшы зімняй ночы.*

*Віхура гурбы намяла,*
*Застыла ўсё пад снежнай маскай.*
*Марозам скована рака*
*І лёд блішчыць люстэрным бляскам.*

*Лютуе люты не на жарт,*
*Трашчыць мароз і снегам сыпле.*
*І лес застыў, заледзянеў,*
*Мароз за нос і шчокі шчыпле.*

*Але міне яго пара,*
*Даўжэй на небе сонейка заззяе,*
*Растопяць снег зноў прамяні*
*Вясна на гусельках зайграе.*

*Бурак Анастасія Аляксееўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 13 г. Магілёва”*

## *Калядная ноч*

*Цэлы дзень бушуе  студзень,*
*Замятае ўсе дарогі,*
*Мабыць, добра папрасіў ён*
*У завеі дапамогі.*

*Цемра разлілася рэчкай,*
*Затапіўшы наваколле.*
*“Гэтай ноччу будзе ціха”, -*
*Шэпча снежнае раздолле.*

*Стукае ў вакно марозік,*
*Пакідаючы малюнак:*
*Распісны, бліскучы, свежы,*
*Свой жамчужны пацалунак.*

*Узышла на небе Зорка –*
*Сімвал нараджэння Бога.*
*У душы гарыць надзея:*
*Будзе лёгкаю дарога.*

*Аруцюнян Давід Артуравіч,*
*вучань V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 32 г. Магілёва”*

## *Літара*

*Літара – некалькі ліній.*
*Некалькі літар – слова.*
*Некалькі слоў – гэта горад.*
*Гэта пярун і лівень,*
*Хмары і лужы пад імі.*
*Гэта зіма і холад,*
*Гэта мядзведзі на льдзіне.*
*Гэта вясна і квецень,*
*Гэта вясёлка за рэчкай.*
*Гэта любоў і сустрэча,*
*Гэта гулянне да рання,*
*Гэта спатканне, расстанне*
*І ў садку мілаванне…*
*Літара – некалькі ліній.*
*Некалькі літар – слова.*
*Слова – усяго аснова.*

*Балашэнка Дар'я Юр'еўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "НПК дзіцячы сад –*
*сярэдняя школа № 12 г. Магілёва"*

## *Расстанне*

*У летні вечар, абяцаючы вярнуцца,*
*Адзін на аднаго глядзелі мы ў апошні раз.*
*Каб толькі мог тваёй рукі я зноў крануцца,*
*Каб толькі мог сказаць яшчэ хоць пару фраз…*

*Ты, ціха стоячы, глядзела ў мае вочы,*
*А па шчацэ кацілася сляза.*
*Апошні напамін аб дзіўнай ночы,*
*Бо нейкіх слоў, на жаль, ты не знайшла.*

*А за акном шумела навальніца,*
*І кроплі падалі на нас, нібыта ў такт.*
*Як у той дзень, грымнула бліскавіца,*
*А я трымаў старэнькі парасон у руках.*

*Мінуў ужо месяц…Час расстання…*
*Хацеў я сціпла цалаваць тваю руку,*
*Але ты адхінулася… Апошняга прызнання*
*І цёплы вечар той забыць я не магу.*

*Тваіх духоў я памятаю водар:*
*Ён для мяне, як сонца, яблык, кропель стук.*
*Тэлефаную - трубку не бярэш ніколі.*
*Напэўна, ты змяніла тэлефон...*

*Верацennікава Паліна Аляксандраўна,*
*вучаніца XI класа*
*Ліцэя міждзяржаўнай адукацыйнай*
*установы вышэйшай адукацыі*
*«Беларуска-Расійскі ўніверсітэт»*

## *Крочыць зіма па зямлі*

*Снегам бялюткім атулены*
*Вёскі, лясы і палі…*
*Белай, чароўнаю казкаю*
*Крочыць зіма па зямлі.*

*Лыжы, канькі, горкі, крэпасці –*
*Смеху на кожным двары!*
*Шчырай дзіцячаю радасцю*
*Крочыць зіма па зямлі.*

*Ёлкі, цукеркі, калядкі,*
*Яркая зорка гарыць…*
*Святамі навагоднімі*
*Крочыць зіма па зямлі!*

*Прохараў Раман Сяргеевіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва"*

## *Свет маленства*

*Заплюшчу вочы – я ў вёсцы,*
*І песняй льецца ўспамін*
*Пра гаманлівае дзяцінства,*
*Пяшчотна-пухкае, як блін.*

*Бабулю бачу за кудзеляй,*
*І казка тчэцца давідна,*
*У дабрыні сваёй люляе,*
*Нясе на крылах да святла.*

*І так мне цёпла, так утульна*
*Ад гэтых родныхспеўных слоў,*
*Нібы на грубцы грэю сэрца,*
*П'ю чай валошкавы нагбом.*

*Вось з дзедам я на сенажаці,*
*Ушыркі рукі развяду –*
*І палячу ў атаву носам,*
*Мякчэй пасцелькі не знайду.*

*А вось ідзём да пчол у госці,*
*Вакол суніц чырвоных рой,*
*І кружыць галаву ад шчасця*
*Дзяўчынцы-птушачцы малой.*

*Заплюшчу вочы – я ў маленстве,*
*Дзе чую продкаў галасы.*
*Яны бруяць крыніцай мудрай,*
*Іскрацца радасцю зямлі.*

*Я панясу вас асцярожна,*
*Як скарб крыштальны па жыцці,*
*Я атулю вас цеплынёю*
*У душы дзіцячай назаўжды…*

*Грушэцкая Ульяна Яўгенаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 31 г. Магілёва”*

## *Крыгаход*

*Без аб’явы і інструкцыі*
*Вясна распачынае крыгаход,*
*Нажом не бачанай раней канструкцыі,*
*Як масла, рэжа ў рэчцы лёд.*

*На ўсе фігуры геаметрыі*
*Пакрэслены сачысты лёд вадой,*
*І будуць мерачь кіламетрамі*
*Няспешна крыгі шлях апошні свой…*

*А я стаю, як заварожаны,*
*Сярод вясны ў пачатку дня,*
*І ўсё вакол так радасна ўстрывожана,*
*І ў душы вясновых мрояў-мар гульня…*

*Фамін Максім Вітальевіч,*
*вучань VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 33 г. Магілёва”*

## *Снегіры*

*На вішнях у садзе селі снегіры,*
*Кавалачкам  барвовае  зары.*

*Іх не палохаюць мяцеліца, мароз,*
*Вісяць на быльніку і на галлі бяроз.*

*Іх шчэбет ціхі, быццам снегу скрып,*
*Што сыплецца з бярозаў, клёнаў, ліп.*

*Нядоўга пасядзяць -   і  зноў у палёт*
*Над  рэчкай,  закаванаю ў лёд.*

*Над белымі садамі, дымам хат –*
*І дзецям радасці прыносяць шмат …*

*І колькі б ты не жыў гадоў,*
*У дзяцінства вернешся  ізноў.*

*Калі ў час зімовае пары*
*Павіснуць на  галінках снегіры*
*Кавалачкам барвовае зары.*

*Васюк Віялета Дзмітрыеўна,*
*вучаніца ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 34 г. Магілёва”*

## *Сямейны альбом*

*Сямейны альбом дастаю з антрэсоляў,*
*З цікавасцю старыя здымкі гляджу:*
*Вось маці стаіць на квітнеючым полі,*
*А вось памятны здымак: мой дзед на Сажу.*
*І побач з ім з вудай мой дзядзька шчаслівы –*
*Вялі шчупак у траве ля іх ног.*
*Вось з братам у кошык збіраю я слівы,*
*На гэтым вось здымку- любімы наш дог.*
*Вось здымак бабулі, па выглядзе строгі.*
*Тут шмат незнаёмых дагэтуль людзей,*
*Стаяць ва ўзнагародах на Дзень Перамогі.*
*А тут мяне маці ў клас першы вядзе.*
*Гартаю лісты, не магу наглядзецца.*
*Вось продкі мае- уся на здымку сям'я.*
*…Цяплее ад здымкаў у грудзях маіх сэрца,*
*Здаецца, што з роднымі пабыў разам я.*

*Пугачоў Ягор Мікалаевіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва"*

## *Прыкметы восені*

*Павязалі дрэвы*
*Залатыя шалі,*
*Паляцелі птушкі*
*У воблачныя далі.*

*І палі пустыя…*
*Ціха, адзінока.*
*Дзесьці на ўзлеску*
*Затрашчыць сарока.*

*Расстаўляе восень*
*Сеткі павуціны.*
*Воблакі на небе*
*Быццам у рэчцы льдзіны.*

*Раніцай марозік*
*Серабрыць прастору.*
*Дрэвы снег укрые*
*І сцяжынкі бору.*

*Зноў зіма займае*
*Снежную пасаду.*
*Адзвінела восень*
*Меддзю лістападу…*

*Уласенка Дамініка Юр'еўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*"Магілёўская гарадская гімназія № 1"*

## *Так адбываецца штогод*

*Так адбываецца штогод:*
*Я заміраю ў хваляванні*
*І гэтак, як на Новы год,*
*Чакаю: збудуцца жаданні…*

*Чароўны водар у Раства:*
*Так вабяць да сябе прынадна*
*Аніс, імбір, і мёд, мускат,*
*І смак карыцы з шакаладам,*

*І мандарынаў тонкі пах,*
*І водар прыгажуні ёлкі,*
*Гірляндаў сонечны пажар,*
*Настрой  як колеры вясёлкі.*

*На гэтым свяце для душы*
*Чужым не будзь і слухай сэрца,*
*Дабро для ўсёй Зямлі рабі,*
*Дай людзям ля агню сагрэцца.*

*Чароўны водар у Раства…*
*Праходзяць святы крокам шпаркім,*
*А адчуванне хараства*
*Каляднай зоркай свеціць ярка!*

*Казлова Ганна Яўгенаўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 27 г. Магілёва”*

## *Зімовы ранак*

*Як цудоўна ранкам свежым*
*Прагуляцца ў сонны парк.*
*Ён завеены ды снежны,*
*Як у казцы акурат.*

*На рабінах ды бярозах –*
*Шэрань белай бахрамой.*
*Ззяе снег, крыху марозны,*
*Ды сінічак чуйны звон.*

*Як чырвоны спелы яблык*
*На ялінку сеў снягір.*
*Ён надуты, вельмі важны,*
*Вочкі ў любасці прыкрыў.*

*Зграя галак прыляцела*
*Каб рабіны пакляваць.*
*Расхапалі гронкі смела –*
*Вельмі смачна ім, відаць.*

*Прагуляюсь па сцяжынках,*
*З асалодай адпачну…*
*Як цудоўна на Радзіме!*
*Беларусь, цябе люблю!*

*Міхасёў Арцём Міхайлавіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва”*

## *Пахаванка*

*Плач і енк у кожнай хаце…*
*Плачуць жонкі, сёстры, дзеці, плачуць маці.*
*Іх “саколік” больш не вернецца дадому.*
*Як тлумачыць гэта хлопчыку малому?*
*Ручкай ён махаў і позіркам праводзіў,*
*Калі тата бараніць сваю радзіму адыходзіў.*
*Зараз той хлапчук і сам ужо дзядуля,*
*Але помніць, як паказвала матуля*
*Пахаванку, усе памятыя краі:*
*- Муж геройскі ваш загінуў у баі.*
*Хлопчык плакаў, ганарыўся сваім татам,*
*Хоць не быў той афіцэрам, быў салдатам.*
*Ён жыццё аддаў за родную краіну,*
*Каб жылося добра маці, жонцы, сыну.*
*І праз столькі год той подзвіг не забыты:*
*Кветкі праўнукі кладуць на пліты*
*І стаяць ля абеліска ў каравуле*
*У памяць продкам, што з дарогі не звярнулі.*

*Маневіч Мілана Іванаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 40 г. Магілёва”*

## *Летняя радасць*

*Летні дзень, цудоўны дзень!*
*Сонца ярка свеціць.*
*Спевы птушак, дрэваў цень,*
*Радуюцца дзеці.*

*На лугу – пчаліны рой*
*Кветачкі смакуе,*
*А бабулечка мяне*
*Мёдам пачастуе.*

*Тут рамонкі, чабарок,*
*Васількі, званочкі.*
*Водар чуецца здалёк*
*Раніцай і ноччу.*

*Ля ракі, што ўдаль бяжыць,*
*Плёскат, смех, гулянне.*
*Ветрык лёгенька дрыжыць*
*Ад галасоў гучання.*

*Летні дзень, цудоўны дзень!*
*Шчасце лье бясконца.*
*Цёплы сонечны прамень*
*Пасылае сонца.*

*Ловяць людзі, птушкі, бор*
*Сонечны праменьчык.*
*Усё сплятаецца ў хор*
*Летняй цёплай песняй!*

*Якаўлева Ганна Андрэеўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі ''Сярэдняя*
*школа № 46 г. Магілёва''*

## *Я так адчуваю мір*

*Прамень ласкавы сонечны*
*Мой ранак пачынае:*
*Усмешку, задаволенасць,*
*Дзень новы прабуджае.*
*З павагаю і нежнасцю*
*Матулю абдымаю.*
*Я гэтым ранкам ветлівым*
*Пяшчоту адчуваю.*
*З сябрамі сустракаюся.*
*Здзіўляюся і мару.*
*Смуткую, усміхаюся*
*Ды радасці жадаю.*
*Быць міласэрдным хочацца,*
*Умець прабачыць усім,*
*Каб шчасце побач крочыла,*
*Каб на Зямлі быў мір*

*Крываносаў Сцяпан Аляксандравіч,*
*вучань V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “НПК яслі-сад – сярэдняя школа № 44 г. Магілёва”*

## *Дабрыня сэрца*

*Сцеражыце ад гневу сэрца,*
*Сцеражыце яго ад злосці.*
*Адкрывайце душы акенца,*
*Запрашайце пяшчоту ў госці.*

*Усміхайцеся добрым людзям,*
*Абыходзьце халодных, слізкіх.*
*Хай ў сэрцы спагада будзе*
*Да чужых і да самых блізкіх.*

*Не хавайце яе да часу,*
*Раздавайце ўсю без астатку.*
*Дзень закончыцца, прыйдзе новы,*
*Вы ж пачніце ўсё з пачатку.*

*Выбірайце сяброў прыгожых,*
*Ды не знешнасцю, а душою.*
*Кепскіх, хітрых і ненадзейных*
*Абыходзьце вы стараною.*

*Адкрывайце сэрца для шчасця,*
*Адкрывайце яго для света.*
*Добрым словам людзей вітайце*
*Ды жывіце так доўгія лета.*

*Хрытоненка Ян Віктаравіч,*
*вучань IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 26 г. Магілёва”*

## *Новы год*

*Ноч прылегла на ўзгоркі –*
*Спаць і ей даўно пара,*
*У паднябессі змоўклі зоркі,*
*Спіць і наша дзетвара.*

*Спіць зямля пад цёплай коўдрай,*
*Што раскінуў Дзед Мароз.*
*Ён - дзядуля вельмі добры,*
*Падарункі ўсім прывёз.*

*Падарыў ён шапку елцы,*
*Зайкам, ліскам – па кватэрцы,*
*Падарыў рачулцы мосцік,*
*Каб прыехаць Дзеду ў госці.*

*Санкі ціха пад'язджаюць*
*Да дзвярэй і да варот,*
*Віншаваць распачынаюць*
*Дзед Мароз ды Новы год!*

*Крыванос Крысціна Якаўлеўна,*
*вучаніца ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва"*

## *Хутка*

*Хутка прыйдзе зіма,*
*Запарошыць сцяжынкі,*
*У марозным паветры*
*Заіскрацца сняжынкі.*

*Хутка поле засне,*
*Лес задрэмле кашлаты.*
*Шызы з коміна дым*
*Паплыве па-над хатай.*

*Хутка  рэкі прыпыняць*
*Свой бег хуткаплынны.*
*І зямля пад пакровам*
*Пухнатым застыне.*

*Упрыгожацца дрэвы*
*Іскрыстым уборам.*
*Цішыня і спакой*
*Паплывуць над прасторам.*

*Хутка…*

*Балашэнка Вераніка Уладзіміраўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 43 г. Магілёва”*

## *Рух, рытм, мелодыя і крокі*

*Адчуць сябе нібы ў палёце,*
*Кружыцца плаўна, узмах-другі!*
*Быць птушкай вольнай на свабодзе,*
*Сапраўднай быць, жыць без тугі.*

*Як танцаваць, падкажа цела:*
*Калі прысесці, рукі ўзняць.*
*Пачнеш ты рухацца нясмела,*
*Затым цябе ўжо не стрымаць.*

*Нязмушанасць і думак рой,*
*Жаданне рухацца, кружыцца.*
*Узлёт эмоцый і настрой…*
*Так можна і пра ўсё забыцца.*

*Рух, рытм, мелодыя і крокі.*
*Назад, уперад, паварот,*
*Прагіб, рывок – як скачуць ногі…*
*Сыходзіць ужо дзясяты пот.*

*Ты з цягам часу разумееш,*
*Што, калі часта ў рытм кружыцца,*
*То танец зможа паступова*
*І ў сэнс жыцця пераўтварыцца.*

*Бо танец – гэта не на дзень*
*Ды не на два з нагоды –*
*Мастацтва не сябруе з “Не”,*
*Жыве яно са мной заўсёды.*

*Міланіч Вераніка Аляксееўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Гімназія № 4 г. Магілёва”*

## *Зіма*

*Зіма прыйшла. Рыпіць сняжок.*
*Мароз мацней за шчокі шчыпле.*
*Снежань сняжынкамі сняжыць*
*І на зямлю іх сыпле, сыпле.*

*Бялее хутка далягляд,*
*Абрусам мяккім снег лажыцца.*
*Віхура ў коміне гудзе,*
*Кідае снегам і кружыцца.*

*Мароз трашчыць уначы мацней*
*І крэкчуць старыя яліны.*
*Зіма падорыць шапкі ім,*
*Засыпле снегам пні, лагчыны.*

*Засне зямля ў зімовы час*
*І будзе моцы набірацца.*
*А дзеці рады, бо зіма –*
*Пара на горачцы катацца.*

*Абраменка Ганна Яўгеньеўна,*
*вучаніца ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 13 г. Магілёва"*

## *Памяць маёй сям'і*

*Вы думаеце, памяць наша вечная?*
*Так, бо змагла надоўга захаваць*
*Вайну, і боль, і словы светлыя,*
*Што трэба кожнаму  ў жыцці пазнаць.*

*Сцяна, партрэт -  вайна на фотаздымку.*
*Баец прыгожы – малады юнак,*
*Усмешка светлая, з дзяўчынай у абдымку…*
*З дзяцінства чуў, што гэта прадзед наш.*

*Так я запомніў тое вечнае, жывое,*
*Што так цаніла ўся мая сям'я:*
*Дзядулю, абарону Магілёва - ўсё святое,*
*Зямлю, што нас заўсёды берагла.*

*Той бой,  калі зямля дрыжала,*
*Дзе ўсё вакол пакрылася крывёй,*
*Мы ўспамінаем кожны раз нямала,*
*Калі збіраемся на свята ўсёй сям'ёй.*

*Няхай праходзіць час, і пахнуць кветкі.*
*А мы ў сям'і навекі будзем знаць,*
*Што думкі чыстыя, і пожні, і палеткі*
*Наш прадзядуля змог адваяваць!*

*Волк Вікторыя Андрэеўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва"*

### *Шчасце любіць цішыню*

*Шчасце любіць цішыню,*
*А не штодзённую мітусню.*
*Кожны шукае да яго сцяжыну*
*І чакае поспеху хвіліну.*

*Трэба толькі пастарацца,*
*Ну а потым не зазнацца:*
*Шчасце любіць цішыню,*
*А ненавідзіць подласць і ману.*

*Не бойся спрабаваць і марыць!*
*Удача сярод смелых гаспадарыць!*
*І памятай: не трэба выхваляцца,*
*Бо часам шчасце можа лёгкім здацца.*

*Гэта не так! Ты памыляешся,*
*Калі з лёгкім шчасцем згаджаешся:*
*Патрэбны сіла, праца, час,*
*Каб поспех завітаў да нас.*

*Але не бойся, усё магчыма:*
*Адзнакі, каханне, круіз і машына,*
*Паступленне, шчаслівая сям’я.*
*Жаданыя словы - гэта ўсё я!*

*Трэба толькі пастарацца,*
*Ну а потым не зазнацца,*
*Бо шчасце любіць цішыню.*
*Вер заўсёды ў мару сваю!*

*Усё будзе так, жаданні памножыш,*
*Жыццё, безумоўна, ты ўпрыгожыш.*
*Шчаслівым будзеш. Абяцаю!*
*Так. Я цябе на ўвазе маю!*

*Зямлянская Ксенія Андрэеўна,*
*вучаніца XI класа*
*Ліцэя міждзяржаўнай адукацыйнай*
*установы вышэйшай адукацыі*
*«Беларуска-Расійскі ўніверсітэт»*

## *Прырода дэкарацыі мяняе*

*Прырода дэкарацыі мяняе,*
*Цяплеюць фарбы з кожным новым днём,*
*Сівы туман іх усё-такі змывае*
*Супольна з надакучлівым дажджом.*

*Ужо гаі прыкметна парадзелі,*
*Птушыны гоман не трывожыць плёс.*
*Пакарацелі дні, а ночы падаўжэлі,*
*Пажоўкла, стала бруднай сінь нябёс.*

*А пад нагамі лісце і ігліца,*
*Нясу лясоў багатыя дары…*
*На ўсе сцяжынкі восень-масцярыца*
*Саткала залатыя дываны.*

*Нігамядзянава Вікторыя Вячаславаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 33 г. Магілёва”*

## *Дзень адзінства*

*Мы святкуем Дзень Адзінства.*
*Дзень яднання ўрачысты.*
*Дрэвы ў парках і садах*
*Мы пасадзім у радах.*
*Выйдзем з песнямі, сцягамі –*
*Будзем радавацца з вамі,*
*Што жывём у краіне шчырай,*
*Сацыяльнай, справядлівай.*
*Помнім подзвігі дзядоў,*
*Што за нас пралілі кроў.*
*Мы мінулае шануем*
*І шчаслівы лёс будуем.*
*У адзінстве наш народ –*
*Незалежнасці аплот.*
*Мая родная краіна,*
*Назаўсёды ты адзіна!*

*Федарэнка Ілья Дзмітрыевіч,*
*вучань VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 45 г. Магілёва”*

## *Песня роднай прыродзе*

*Я многа бачыла краін,*
*Замежных сонечных мясцін,*
*Аднак заўжды дадому кліча*
*Прыроды роднае аблічча.*

*У нас зіма бывае рознай.*
*Канешне, лепш, калі марознай.*
*Пакрыта ўсё іскрыстым снегам,*
*І дзетвара імчыць са смехам*
*На лыжах, санках, на каньках,*
*Чырвоная, смяецца…ах!*

*Але мілей вясны дыханне*
*І звонкіх ручаёў журчанне,*
*Пралесак першыя ўсмешкі*
*І спеў птушыны каля сцежкі.*

*А вось і падаспела лета,*
*У зелень і блакіт адзета.*
*У бары суніцы чырванеюць,*
*У полі васількі сінеюць…*
*Прыемна пазіраць на гэта!*
*О, як прыгожа наша лета!*

*Але ўжо восень надыходзіць,*
*З двара мятлою лета гоніць.*
*І лісце колер свой мяняе,*
*На дол паціху ападае.*
*У вырай птушкі адлятаюць*

*І да вясны нас пакідаюць…*

*Мне міла нашая прырода.*
*Люблю яе ўсе поры года.*
*Няхай квітнее родны край!*
*Шануй яго, аберагай!*

*Чуракова Дар'я Аляксандраўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 41 г. Магілёва”*

## *Зіма*

*Эй, зіма, зміа, зіма!*
*Весялей цябе няма.*
*Снег ідзе, ідзе, ідзе,*
*І Мароза к нам вядзе.*
*Новы год, калядкі, смех –*
*Прынясе ён цэлы мех.*
*Будзе весела ў нас*
*У зімовы гэты час!*
*Гэты яркі белы час*
*Поўны снегам будзе ў нас.*
*Каб не змерзлі мы зусім,*
*Будзем хутка мы ісці.*

*Шаршнёў Арсень Вячаслававіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 32 г. Магілёва”*

## *Восень*

*Наступіла восень,*
*Жоўтым стаў наш сад.*
*На бярозах лісцейкі*
*Золатам гарадь.*

*І не чутна болей*
*Спеваў салаўя,*
*Паляцелі птушкі,*
*І сумую я.*

*Не спяшайся, восень,*
*Разматаць дажджы,*
*Рассцяліць туманы,*
*Лісцяў віражы.*

*Дай перакanацца*
*У свежасці цішы,*
*У бяздоннай сіні,*
*У полымі асін.*

*Восень сустракае*
*Ветліва ўсіх нас,*
*Шчасця нам жадае.*
*Гэта яе час.*

*Няхай сум і скруха*
*Растаюць пад дажджом.*
*А восень-свякруха*
*Прыйдзе мамай у дом.*

*Будзем шчыра рады*
*Мілай госці мы.*
*Дзён асенніх мала*
*Да светлай зімы.*

*Не сумуйце, людзі,*
*Хмаркай знікне восень,*
*Дачакацца сонца,*
*З радасцю вас просім.*

*Шамесава Карнелія Яўгенаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 31 г. Магілёва"*

## *Плача Маці-Зямля*

*Плача Маці-Зямля,  днём і ноччу чуваць яе стогны,*
*Не  загояцца раны ў грудзях, як маўклівыя сведкі баёў,*
*Бо схавала ў нетрах ваенных, для мяне і цябе незнаёмых,*
*Для яе ж – усё блізкіх і родных дачок і сыноў.*

*Партызанскія сосны ім сумныя песні спяваюць,*
*І разносіцца ветрам той ціхі і вечны напеў*
*У свеце тым, дзе аб подзвігах памяць губляюць,*
*Як наш прадзед за мір на варожыя кулі ляцеў.*

*Забываюцца  творы, знішчаюцца помнікі, скверы,*
*Што віталі імёны герояў той страшнай вайны,*
*Зачыняюць нашчадкі ў мінулае дзверы… Плача Маці-Зямля*
*І сынам сваім кажа, што гісторыю ведаць павінны яны!*

*Цюко Карына Аляксандраўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва”*

## *Вясновае спатканне*

*Зноў прыходзіць вясна:*
*Усё бліжэй адчуваю дыханне*
*Гэтай светлай пары*
*І табе прызначаю спатканне.*

*Буду з сонцам чакаць*
*Я цябе ля зялёнага гаю,*
*Ля блакітнай ракі*
*Я спатканне табе прызначаю.*

*Ля высокай гары*
*І ля лесу, густога, сівога,*
*Там, дзе з ранняй вясной*
*Сустракаецца шчасця дарога.*

*Там, дзе птушкі пяюць,*
*Дзе ў кветках стракатых паляны,*
*Дзе праходзяць дзянькі*
*Вельмі шпарка для ўсіх закаханых.*

*Дзе палын ля ракі*
*Не такім ужо горкім здаецца,*
*Дзе пяюць салаўі*
*І ад шчасця сціскаецца сэрца.*

*Дзе ўжо з першым цяплом*
*На абсохлым ад снегу ўзлеску*
*Усміхаецца мне*
*Сінявокая кветка-пралеска.*

*Там у марах сваіх да цябе*
*На світанку звярнуся:*
*“Дык давай жа з табой*
*Мы сустрэнем вясну ў Беларусі!”*

*Будкевіч Марыя Аляксееўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 1 г. Магілёва”*

## *Зімовы вечар*

*Вечар, снег,зіма, мароз.*
*Не хавай у шалік нос.*
*Што навокал - паглядзі!*
*З дому ты хутчэй хадзі!*
*Зіхаціць, іскрыцца снег,*
*Чуеш, лёгкіх санак бег?*
*Усё бялюсенька і чыста,*
*Так прыгожа, так празрыста!*
*Весяліцца дзетвара,*
*Лепіць бабу ля двара.*
*Хто з дзіцячага садка,*
*Хто са школы, хто з катка.*
*Смех гучыць з усіх бакоў,*
*Шчасце нават для бацькоў.*
*Зноў да нас прыйшла зіма,*
*Нам дадому не пара...*

*Якаўлева Ірына Уладзіміраўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 38 г. Магілёва”*

## *Як хораша зімою!*

*Як хораша зімою*
*Гуляць нам у двары.*
*Вакол, куды ні глянеш,*
*Бялюткі снег ляжыць.*

*Нам весела з сябрамі*
*Катацца на санях*
*І падаць у снег халодны…*
*Аж горача ў грудзях!*

*У гурбах мы хаваемся,*
*Гуляем у сняжкі.*
*– Ой, як жа гэта весела!*
*Хадзем да нас і ты.*

*Пантаплёва Дар’я Юр’еўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Гімназія № 3 г. Магілёва”*

## *Стары салдат*

*Стары салдат, ты пра вайну мне раскажы,*
*Чаму не спіцца табе ноччу, адкажы?*
*Ці раны баявыя ўсё баляць,*
*Ці боль  пякучы ў сэрцы не суняць?*

*Ці ўспамінаеш, родны, як у бой*
*Ішлі салдаты маладыя за табой?*
*І франтавыя цяжкія дарогі,*
*І тых, хто не дажыў да Перамогі…*

*Забыць не можаш ты той страшны час,*
*На кожным кроку смерць чакала вас…*
*Чакалі маці, што вярнуцца іх сыны,*
*Але не ўсе прыйшлі дамоў з вайны…*

*Прайшлі гады, адзін застаўся ты жывы,*
*Той малады салдат, але зусім сівы.*
*Жывуць у душы тваёй былыя ўспаміны,*
*Якія, раскажы! Мы памятаць павінны!*

*Грукае сэрца ў грудзях, як набат…*
*Дзякуй табе, мой адважны салдат!*

*Зямцова Аляксандра Андрэеўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 5 г. Магілёва”*

## *Зіма-чараўніца*

*Мароз ахутаў срэбрам дрэвы,*
*Стаіўся ціха над зямлёй.*
*Ад самых старажытных спеваў*
*Завецца гэты час зімой.*

*Нячутны гоман птушак у небе.*
*Снег хрупаціць, ды вецер вые.*
*Як соль на смачным чорным хлебе,*
*Бялеюць сцежкі палявыя.*

*А часам сонца бліснe ярка,*
*За пэндзаль возьмецца зіма-*
*І на акне прачнецца казка,*
*Што ў свеце прыгажэй няма.*

*Закруціць снегам завіруха.*
*Прачнецца злосны чарадзей.*
*Хапаць пачне за нос, за вуха.*
*Так ён жартуе з нас - людзей.*

*Люблю зіму з яе прыгодамі,*
*Калі на яве, нібы ў сне,*
*Плывуць сумёты карагодамі*
*І снег іскрыцца ў сіняве.*

*Рабцава Ганна Сяргееўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 17 г. Магілёва"*

## *На горцы*

*Ах зіма! Ох зіма!*
*Гурбы снегу намяла.*
*Горку зробім у двары*
*На пацеху дзетвары.*

*Хто на лыжах, хто на санках*
*Выбягайце хутка ранкам*
*І з гары нясіцесь шпарка,*
*Каб марозу было жарка.*

*Пасябруем мы з зімой,*
*Не спяшаемся дамой.*
*Целы дзень на горцы смех,*
*Хоць збірай яго ў мех.*

*Сафонава Вераніка Андрэеўна,*
*вучаніца ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 32 г. Магілёва”*

## *Прыгажосць*

*Выйшла раніцай у школу*
*І замёрла: што за цуд?*
*Быццам чараўнік вясёлы*
*Паразвешваў срэбра тут.*

*На галінках, на ялінках,*
*На кустах і правадах*
*Зззяе ўсё, усё ў іскрынках,*
*Так прыгожа – проста "ах"!*

*Радасна ў наваколлі:*
*Сонца ззяе, снег рыпіць.*
*На прыволлі, на раздоллі*
*Добра мне з сябрамі жыць!*

*Войтава Анастасія Дзмітрыеўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 43 г. Магілёва"*

## *Зімовы вецер*

*Падмарожаны вецер скуголіць*
*За акном, замятае сляды.*
*І галіны сівыя няволіць,*
*Каб сканаў год стары назаўжды.*

*Падмарожаны вецер рыдае –*
*Енчыць, плача, крычыць, як дзіця.*
*Ён аблокі па небе ганяе,*
*Каб хутчэй наступіла вясна.*

*Падмарожаны вецер сумёты*
*На сцюдзёнай рацэ намасціў.*
*Пазбіваў гурбы сіверным дротам,*
*Быццам крыўду на лёд затаіў.*

*Захалоджаны вецер стаміўся*
*Разганяць са двароў сіні дым…*
*Ён да хаты прынік, прытуліўся*
*І… заснуў да наступнай зімы…*

*Смышляева Аліса Кірылаўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 7 г. Магілёва”*

## *Люблю*

*Люблю цябе, мая Радзіма,*
*Твае лясы, твае палі.*
*Ты, як і маці, усім на дзіва*
*Паўнютка шчырай дабрыні.*

*Люблю я песню, што ў галінках*
*Пяе так гучна салавей,*
*Каб летам кожная травінка*
*На свет глядзела весялей.*

*Люблю бярозку, што ля рэчкі*
*Калісьці стройнаю расла,*
*Салдат ратуючы ад смерці,*
*Сама знявечана была.*

*Цвіці ж, квітней, мая Радзіма,*
*І з веку ў век будзь прыгажэй!*
*Жыві заўжды ў сям'і адзінай,*
*Душой і тварам маладзей!*

*Чарнова Маргарыта Алегаўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 33 г. Магілёва"*

## *Возера-люстэрка*

*Ёсць ля нашай хаты*
*Возера-люстэрка,*
*Як гаворыць тата,*
*Сіняя талерка.*

*Летнімі дзянькамі*
*Знойдзеш тут прахладу.*
*Між двума пянькамі –*
*Лаўка як прылада.*

*Увосень чырванее*
*Ад ліствы вадзіца.*
*Першым клён паспее*
*Да вады схіліцца.*

*І каток гатовы*
*Зімняю парою.*
*Без лішняе дамовы*
*Катаемся зімою.*

*Возера мы любім,*
*Тут адпачываем.*
*Як куды паедзем,*
*Яго ўспамінаем.*

*Зяткіна Ксенія Віктараўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 19 г. Магілёва”*

## Дзень Перамогі

Дзень Перамогі – з кветкамі май.
Аркестр духавы, марш святочны іграй!
Ідуць ваенныя калоны,
Як тыя шэрагам вагоны.
Ідуць салдаты і дзяўчаты,
Урачысты сцяг яны нясуць,
А разам з імі ветэраны
Да вечнага агню ідуць.
Успомніць тых, хто перамог,
Аддаў жыццё за родны край.
Каб мірна жыць народ наш мог,
Ты  подзвіг той не забывай.
Чакаю кожны год я свята,
Каб зноў на плошчу мне прыйсці,
Аддаць пашану ветэранам
І свой паклон ім да зямлі.

*Сімкін Дзмітрый Уладзіміравіч,*
*вучань V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 15 г. Магілёва”*

## *Сум прыроды*

*Сумуе восенню прырода…*
*Вось падае апошні ліст…*
*Дзе тое лета, асалода?*
*Дзе шчэбет птушак, гоман, свіст?*
*Чаму палі так апусцелі?*
*Дзе фарбы яркія лугоў?*
*І толькі зелянеюць елі,*
*Як памяць добрая лясоў…*
*А зараз – голае ўбранне,*
*Як сірацiна, лес стаіць.*
*У сэрцы дрэў адно жаданне,*
*Хто б гэту беднасць змог прыкрыць.*
*О, даў бы хто палям адзенне,*
*Лугі хто б коўдраю накрыў*
*І гэта голае каменне*
*Ад погляду людзей сакрыў.*
*Прырода плакала дажджамі,*
*Ад гора вецер завываў.*
*І хмарны позірк над лясамі*
*Праменьчык сонца закрываў.*
*Прырода восенню жадала*
*Лахмоцце на ўбор змяніць,*
*І змен пакутліва чакала,*
*Хто б мог ёй у гэтым падсабіць.*
*І вось аднойчы раніцою,*
*Калі ўвесь свет яшчэ драмаў,*
*Вялізнай белаю сцяною*
*Пушысты снег на зямлю паў.*
*Хто мог пазнаць бы гэта поле,*

*І гэты луг, і лес, і гай?*
*Вакол, як чыстае раздолле,*
*Мой беларускі родны край.*

*Кандрацьеў Канстанцін Сяргеевіч,*
*вучань VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 6 г. Магілёва”*

## *Паспець бы…*

*Ляціць жыццё даволі хуткацечна,*
*Бяжыць імкліва – не дагнаць.*
*Мы разумеем, што жыццё не вечна,*
*І не спазніцца б усё зрабіць паспець.*

*Паспець жыццё святлом ахутаць*
*Душы сваёй і сэрцайка свайго.*
*Дапамагчы парадай чалавеку*
*І не пакрыўдзіць гонар бы яго.*

*Паспець бы ўсмешку падарыць,*
*Цяпло душы, надзею, дабрыню.*
*І лёгкую памылку выправіць,*
*І здзейсніць мару чыстую сваю.*

*Паспець да Бога б нам звярнуцца*
*І навучыцца верыць, дараваць.*
*Паспець бы шчасцем падзяліцца,*
*Паспець бы чалавекам стаць.*

*Дракіна Ганна Ягораўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 31 г. Магілёва”*

## *Радзіма*

*Хто можа сказаць, што Радзімай завецца?*
*Мой край, дзе так добра, шчасліва жывецца.*
*Той кут, дзе жывуць мае родныя людзі,*
*Краіна, у якой вольна дыхаюць грудзі,*

*Дзе песняй жаўрук нам вясну абуджае,*
*Дзе бусел, раскінуўшы крылы, лунае,*
*Дзе першай пралескай заззяюць нябёсы,*
*Дзе светлыя вочы і светлыя косы.*

*Шумяць, не змаўкаюць лясы, пералескі…*
*Тут птушкі прыносяць нам добрыя весткі.*
*Азёрны блакіт адлюстроўвае неба,*
*І залата хвалі ў спелага хлеба…*

*Радзіма – той край, без якога не жыць,*
*Той край, дзе мяне навучылі любіць,*
*Той край, за які я б жыццё аддала,*
*Каб не была ў ім слёз, бед ці зла!*

*Радзіма мая для мяне, як матуля,*
*Адорыць любоўю, да сэрца прытуліць…*
*Мая Беларусь – даражэйшая ў свеце!*
*Адзіная ты назаўжды ў сусвеце!*

*Сіткевіч Паліна Дзмітрыеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 46 г. Магілёва”*

## *Прыгода ў лесе*

*Аднойчы вожык і лісічка*
*Пайшлі ў лясочак ў грыбы.*
*І гэта бачыла сінічка,*
*Што паляцела на дубы.*

*Збіралі доўга. Вечарэла.*
*Прыйшла пара ісці дамоў.*
*І тут лісічка зразумела,*
*Што заблукалі яны зноў.*

*Крычалі, звалі дапамогу,*
*Але ніхто не адказаў.*
*Сінічка села на дарогу –*
*І тут жа вожыкe прыгадаў,*

*Што менавіта гэта сцежка*
*Сяброў дадому прывядзе.*
*Падзячылі ёй усмешкай,*
*Што не пакінула ў бядзе.*

*Тхараў Арцём Міхайлавіч,*
*вучань V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 21 г. Магілёва”*

## ***Вясна***

*Гром грыміць, і мые ліўнем*
*Твар зямлі пяшчотны дождж.*
*Ветрык цёплы песні грае,*
*Зноў слязьмі разліўся Сож.*

*Па вясеннім небасхіле*
*Хмаркі ў роздумах плывуць,*
*Хутка, хутка на падвор'і*
*Вішні снегам расцвітуць.*

*У лесе сонным на палянах*
*Зноў пралескі расцвілі,*
*У полі снежныя  ўзгоркі*
*Ручайкамі пацяклі.*

*Водар свежасці вясенняй,*
*Прыгажосць маёй зямлі…*
*У сэрцы ясна, добра, светла*
*І лагодна на душы.*

*Лаўрова Паліна Андрэеўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 2 г. Магілёва"*

## *Зіма*

*Зіма ўсіх дзяцей сустракае,*
*Марозам і снегам вітае!*
*Сінічкі ляцяць да кармушак,*
*Пад’есці ў зімовую сцюжу!*
*Зіма – гэта радасць, канькі і каток,*
*Санкі, гара, снегавік, Новы год!*
*Дзед Мароз цягне вялікі мяшок,*
*І з неба ляціць на нас белы сняжок!*
*Заснула рака, ўсё пакрыта ільдом,*
*У белым зімовым адзенні мой дом!*
*Мароз-чараўнік вокны нам размалюе,*
*Прыгожымі ўзорамі ўсіх зачаруе!*

*Пятрова Дар'я Паўлаўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 41 г. Магілёва”*

## *Навагодні эцюд*

*Пышныя сумёты,*
*Сонца ў арэоле.*
*Серабром іскрацца*
*Локаны бяроз.*
*Бычыш: снег клубіцца.*
*Нацянькі па полі*
*Мчыць да нас на ёлку,*
*Пэўна, Дзед Мароз!*
*У лесе, як у казцы,*
*Ёлкі ў модных шубках,*
*Нібы каралевы,*
*Водзяць карагод.*
*Ветрык ім шапоча:*
*“Елачкі! Красуні!”*
*І святлеюць далі –*
*Хутка Новы год!*

*Семуценка Марыя Сяргееўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “НПК дзіцячы сад – сярэдняя школа № 12 г. Магілёва”*

## *Мора*

*Я зноўку на цябе гляджу.*
*Я ад душы цябе вітаю.*
*Да мора ў госці прыхажу*
*Не толькі ў сне, а і на яве.*

*Гляджу ў глыбіню вады –*
*І захаплення не хаваю.*
*Як колеры змяняеш ты!*
*Я ад здзіўлення заміраю.*

*Мяне завуць марскія далі…*
*І сэрца радасць запаўняе,*
*Калі ўзбуджаная хваля*
*На бераг хутка набягае.*

*Мінае райскі час ізноў,*
*І дзень растання наступае.*
*На развітанне замест слоў*
*Як моцна мора абдымае!*

*Вязу дадому скарб я свой:*
*Ракушак колькі, сувеніры*
*І тое, что заўжды са мной -*
*Мае аб моры ўспаміны.*

*Гузаў Аляксандр Вітальевіч,*
*вучань VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "НПК яслі-сад –*
*сярэдняя школа № 44 г. Магілёва"*

## *Ноч. Цішыня. Асалода*

*Ноч. Цішыня. Асалода…*
*Успаміны. Развагі. Сумненні…*
*Перажытае стукае ў шыбу,*
*Быццам глыток летуценняў.*
*Спробы. Жаданні. Памылкі…*
*Узлёты. Натхненне. Падзенне…*
*І аксамітныя тыя абдымкі,*
*Што вырываюць мяне з ценю…*
*З тым, што было, размінуся.*
*Тое, што будзе, сустрэну.*
*І небяспецы любой усміхнуся,*
*І ўздымуся з каленяў.*
*Ноч. Цішыня. Успаміны…*
*Вера. Каханне. Надзеі…*
*Колькі яшчэ тых імгненняў*
*Ляжа на смутак сумлення…*

*Лунькоў Глеб Аляксеевіч,*
*вучань X класа*
*Ліцэя міждзяржаўнай адукацыйнай установы*
*вышэйшай адукацыі «Беларуска-Расійскі ўніверсітэт»*

## *Беражыце прыроду*

*Хачу, каб усе на свеце*
*Прыроду бераглі,*
*Таму што ўсе мы дзеці*
*Адной на ўсіх Зямлі.*

*Хачу, каб весела і звыкла*
*Спявалі птушкі нам заўжды,*
*Каб рыба ў возеры не знікла*
*Ад вельмі бруднай там вады.*

*Хачу, каб з ружжаў не стралялі*
*У птушак розных і звяроў,*
*Каб статкі велічна гулялі*
*Ласёў, аленяў і зуброў.*

*І сіратою каб не стала*
*У вялізным лесе зайчаня,*
*Хачу, каб у снезе не змярзала*
*Зімой бяздомнае шчаня.*

*І каб калісьці не змялела*
*Цяпер шырокая рака,*
*І каб жахліва не гарэла*
*У траве гняздзечка жаўрука.*

*Прыродзе зло зрабіць – хвіліна.*
*А каб захавалася навек,*
*Мы берагчы яе павінны.*
*Аб гэтым помні, Чалавек!*

*Каешка Аляксандр Іванавіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 33 г. Магілёва”*

## *Зіма!*

*Ох, зімачка, зіма!*
*Прыгожая пара.*
*Падаюць сняжынкі,*
*Як белыя пушынкі.*

*Вецер разгуляўся,*
*Па вецці скок ды скок,*
*А белая мяцеліца*
*Раскінула сняжок.*

*На саначках, вазочках*
*Званочачкі звіняць.*
*У сінім небе зорачкі*
*Ад холаду дрыжаць.*

*І ветрык, і мяцеліца*
*Сняжком зямлю пакрылі*
*І дзецям на канікулах*
*Радасць падарылі.*

*Чарапкова Вера Максімаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*"Гімназія № 2 г. Магілёва"*

## *Пірог шчасця*

*Выбірай кожны дзень толькі шчасце,*
*На кавалкі яго падзялі*
*І раздай яго бацьку, і маці,*
*І сяброў пакрыху надзялі.*

*Як пірог, хай яго пачастуюць,*
*Бо не кожны ў жыцці частаваў,*
*Асабліва калі не шанцуе,*
*Будзе лепшым гасцінцам са страў.*

*Хто адпусціць яго на сняданак,*
*Хтосьці возьме з сабой на абед,*
*Хто з клапотай пакіне на ранак,*
*А камусьці падарыць сусед.*

*Выбірай кожны дзень толькі шчасце,*
*На кавалкі яго падзялі,*
*І ўбачыш, што ўсе, што ты страціў,*
*Табе іншыя зноў аддалі…*

*Пятнікава Ксенія Алегаўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 32 г. Магілёва"*

## *Хлус*

*Праз срабрыстыя хвалі туману,*
*Данясецца агідны смурод,*
*Нарадзіўшыся дзеля падману,*
*Не пабачыць ніколі ўсход.*

*Хлус не ведае сну ці спачыну*
*І мяняе аблічча ўвесь час,*
*Вось учора ён быў малайчына,*
*Ды і сёння маліўся за нас.*

*Заўтра раніцай новую маску,*
*Ён прышые да твару іглой,*
*А пасля мітуслівага бляску*
*Зноў закіне у цёмны пакой.*

*У маленстве, напэўна, у школе*
*Ладзіць хованкі ўсіх навучыў,*
*Не рабіў ён благога ніколі,*
*І не бачылі, каб награшыў.*

*Як завецца той хлус,*
*Што з пачатку жыцця*
*Быў агідны, пусты,*
*Без душы, пачуцця?*

*Вось чырвоныя вочы яго, капыты!*
*Глушыць жудасны рык, страшаць пашчы клыкі?*
*Не, мярзотнік-манюка такі ж, як і ты,*
*Ходзіць побач і не агаляе штыкі.*

*Не крычыць ён  і не патыхае агнём…*
*Азірніся вакол! Можа, хлус – гэта ён?*
*Хай падкажа вачэй яго погляд пусты*

*Майстрова Ніна Андрэеўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Гімназія № 3 г. Магілёва”*

## *Я хачу быць здаровым*

*Я хачу быць заўсёды здаровым,*
*Не хачу я хварэць ніколі.*
*Буду я рабіць зарадку,*
*Спортам буду я займацца:*
*Ныраць, плаваць, абліваццa .*
*Здароўе будзе мацавацца.*
*Буду рэжым дня складаць,*
*Вучобу з адпачынкам чаргаваць.*
*Сняданак з абедам не прапускаць,*
*Сок і гародніну ўжываць.*
*Буду ёсці з апетытам*
*Усе карысныя прадукты.*
*У парку буду я гуляць,*
*Паветра чыстае удыхаць,*
*Каб у аптэцы не бываць.*
*Часцей буду ўсміхацца,*
*Спяваць, скакаць, а не турбавацца.*
*Бо добры настрой і смех*
*Праганяюць хваробы*
*Ад дзяцей і дарослых усіх.*
*Я хачу быць заўсёды здаровым,*
*Не хачу я хварэць ніколі,*
*Каб школу не прапускаць,*
*Каб веды выдатныя атрымаць.*
*І карысным для Радзімы стаць!*

*Храмцоў Ілья Яўгеньевіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва"*

## *Зіма*

*Колькі вершаў пра зіму*
*І паэму не адну.*
*Нашы слаўныя паэты*
*Напісалі – і пры гэтым,*
*Не магу стрымаць радкі,*
*Бо рыфмуюцца яны.*

*Зіма прыходзіць зноў і зноў.*
*Чакаюць радасць і любоў.*
*Святы, падарункі, снег,*
*Елка, Дзед Мароз і смех –*
*Шчыры, радасны, дзіцячы!*
*Новы год з сям'ёй адзначым.*
*І наведаем сяброў, савякоў, бабуль, дзядоў.*
*У каго няма радні, прыйдуць да таго сябры*
*З пажаданнямі цяпла*
*І кахання, і дабра.*

*Сінь нябёс, іскрыцца снег,*
*Горкі, санкі, лыжы, смех.*
*Радуюць зіма і святы.*
*І канікулаў багата!*
*Што яшчэ хачу сказаць?*
*Я далей пералічу:*
*Каб у кожным доме людзі*
*Верылі, што радасць будзе!*
*Што здароўе і любоў,*
*Шчырасць верная сяброў,*
*Праца, мір, спакой і згода –*
*Гэта шчасце для народа!*

*Стэльмакова Дар'я Мікалаеўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 45 г. Магілёва"*

## *Пра бабулін аповед*

*Аповед, прабабуля, твой*
*На ўсё жыццё запомню.*
*Звяртаюся да ўсіх з мальбой:*
*-Давайце ненавідзець войны!*

*Шэры ранак. Цішыня…*
*Вецер дзьме, злуецца.*
*Ды матулечка мая*
*Больш не ўсміхнецца.*

*Не забуду я той дзень,*
*Як гулі машыны,*
*Як зганялі ўсіх людзей*
*Да пустой адрыны.*

*Прадчуваючы бяду*
*Ад фашысцкіх катаў,*
*Маці ціхенька мяне*
*Вывела ў грады.*

*І наказ дала такі :*
*-Ты паўзі, дачушка,*
*Па разоры да ракі,*
*Будзь вольная, птушка.*

*Калі ўбачыла я дым,*
*У роспачы крычала:*
*-Божа, Боженька, пакінь*
*Ты жывой мне маму!*

*Не было ў мяне надзей,*
*Як я ні маліла,*
*Бо "звяр'ё" ўсіх людзей*
*У хляве спаліла.*

*Шмат прайшло ўжо гадоў*
*З той пары гаротнай,*
*А мне часта зноў і зноў*
*Сніцца сон самотны…*

*Маменчыкаў Дзяніс Міхайлавіч,*
*вучань VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 8 г. Магілёва"*